ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дарожным дадатнам „Прафрух“)

На 1 мес. . . — 80 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тел. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., Іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасьлядоў тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -адагку.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЇН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар . . . 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

СУБОТА
5 красавіка 1930 г.
№ 79 (3587)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ і ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

Генэральная праверка суправаджаецца хуткім выпраўленьнем недахопаў

У ХОЙНІЦКІМ, ЧАВУСКІМ І ДУБРОВЕНСКІМ РАЁНАХ ДАСЯГНУТЫ ЗРУХ У ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА СЯЎБЫ, НЕАБХОДНА ЗАМАЦАВАЦЬ ДАСЯГНУТЫЯ ПОСЬПЕХІ

Зараз-жа апавясьціць шырокія бядняцка-серадняцкія масы аб новых ільготах калгасам. Партыйныя арганізацыі папулярызуйце артыкул тав. Сталіна „Адказы таварышам калгасьнікам“

Новыя ільготы калгасам

Ва ўчарайшым нумары «Зьвязды» надрукаваны дакумант вялікай палітычнай важнасьці — гэта пастанова ЦК УсеКП(б) аб новых ільготах калгасам.

Наша партыя вядзе рашучае і жорсткае змаганьне супроць парушальнікаў «ленінскага прынцыпу добраахвотнасьці пры пабудове калгасаў» (Сталін). Наша партыя ўвесь час падкрэсьлівала і падкрэсьлівае, што добраахвотнасьць—адна з неабходных умоў посьпеху калгаснага руху, што «усякая спроба навязаць гвалтам калгасную гаспадарку... можа даць толькі адмоўныя вынікі, можа толькі адштурхнуць сялян ад калгаснага руху».

Але з гэтага зусім не вынікае, што можна прытрымлівацца нейкай тэорыі самацёку, што партыя павінна заняць пазыцыю нейкага нэйтральнага наглядальніка. Наадварот, гэтай тэорыі самацёку, праваапартуністычнай на існасьці, трэба даваць самы рэзкі адпор. Тэорыя «самацёку» ня мае нічога агульнага з генэральнай лініяй партыі, з ленінізмам. Партыя змагалася, змагаецца і будзе заўсёды змагацца за перапрацоўку дробных індывідуальных гаспадарак у буйную аграмаджаную. Не нэйтральны наглядальнік, не пасыўны глядач, а актыўны баец — калектывізацыю — такая задача кожнага камуністага, кожнага калгаснага работніка.

Ня прымус, не загад зьверху, ня гонае дэкрэтаваньне калгаснага руху, а паказ выгаднасьці, перавагі калектыўнае гаспадаркі перад дробнай, індывідуальнай. Гэта адзіна правільны, адзіна магчымы і адзіна эфэктыўны шлях калгаснага будаўніцтва.

«Толькі калі практычна, на вопыце, блізкім да селяніна, будзе даведзена, што пераход да таварыскага, арцельнага зямляробства неабходны і магчымы, толькі тады мы будзем мець права сказаць, што ў такім вялікім сялянскім краі, як Расія, на шляху сацыялістычнага зямляробства зроблен вялікі крок». (Ленін).

Мы паказвалі вышэй—«не пасыўны наглядальнік, а актыўны баец». З гэтага вынікае, што мы, усяк адкідаючы прымус, змагаючыся з ім, будзем актыўна дапамагаць калгасам, будзем заахвочваць сялян, якія ўступаюць у калгасы. З гэтага вынікае, што калгасы і калгасьнікі будуць карыстацца пераважнымі ільготамі параўнальна з сялянамі-індывідуальнікамі.

Тав. Сталін ясна і вычарпальна адказаў на пытаньне, чаму савецкая ўлада дае перавагі калгасам.

«Таму, што калгас зьяўляецца адзіным сродкам выратаваньня сялян ад галечы, таму, што сапраўдная дапамога калгасам зьяўляецца найбольш сапраўднай формай дапамогі беднаце і серадняком» (Сталін).

Гэта месца артыкулу тав. Сталіна трэба шырока папулярызаваць сярод бядняцка-серадняцкіх мас. Трэба на справе, фактамі даводзіць, што калектывізацыя адзіны шлях для вёскі выйсьці з тае галечы і цемры, у якіх яна яшчэ знаходзіцца. Трэба пераканаць сялян, што, узмацняючы калектывізацыю, мы зьмяншаем грань паміж горадам і вёскай. Трэба ўвесь час падкрэсьліваць, што рост і ўмацаваньне калгасаў—удар па тым ідыётызьме вясковага жыцьця, аб якім пісаў некалі Маркс.

Апошняя пастанова ЦК УсеКП(б) аб ільготах калгасам мае надзвычай вялікае значэньне для ўмацаваньня калгаснага руху, для яго далейшага разгортваньня. Яна дае рад новых стымулаў для калектывізацыі, наглядна паказвае перавагі калгасаў.

Пастановай вызваляюцца ад ападаткаваньня на 2 гады каровы, сьвіньні, авечкі, птушка, якія знаходзяцца ня толькі ў калектыўным карыстаньні калгасаў, але і ў **індывідуальным уладаньні** калгасьнікаў.

Грамадзкія гароды і гародныя калгасы карыстаюцца 50-процантнай скідкай пры ападаткаваньні. Новыя плошчы аграмаджаных гародаў і гародных калгасаў зусім вызваляюцца ад падаткаў у ближэйшыя два гады.

На крэдытаваньне калгасаў у гэтым годзе вызначаецца 500 мільёнаў рублёў.

З сялян, якія ўступаюць у калгасы, зьнімаецца запазычанасьць па зямляўпарадкаваньні, праведзеным да ўступленьня іх у калгас, а таксама ўсе штрафы і судовыя спагнаньні, зьвязаныя з выкананьнем сельска-гаспадарчых павіннасьцяй.

Забараняецца прымусовае спагнаньне паявых капіталаў і мэтавых укладаў у крэдытныя т-вы і каапэрацыю.

Забараняецца адлічэньне з прыбыткаў адходнікаў-калгасьнікаў на карысьць калгасу звыш 10 проц. заработку.

Дазваляецца калгасьнікам у вольны ад работы ў калгасе час працаваць па абагуленых калгасных конях (возка, лесазагатоўкі і г. д.) з пэўнымі адлічэньнямі ў фонд калгасаў.

Такія, у асноўным, галоўныя ільготы калгасам і калгасьнікам, якія надаюцца апошняй пастановай ЦК УсеКП(б).

Калгасны рух уступае ў новы этап. Зараз галоўнае, асноўнае—арганізацыя сяўбы, пашырэньне пасеўных плошчаў. Ад таго, як будзе вырашана гэта задача, залежыць умацаваньне калгасаў, далейшы рух наперад. Новыя ільготы калгасам, побач з непаслабным змаганьнем з перагібамі і скрыўленьнямі партыйнай лініі, узмацняць баяздольнасьць калгасаў, іх гаспадарчую моц. Новыя ільготы выклікаюць новы прыліў у калгасы, дадуць штурмоўк да арганізацыі новых баявых калён калгасьнікаў. Пастанова ЦК УсеКП(б) палягчае нам дасягненьне новых посьпехаў, новых перамог на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

ХОЙНІЦКІ РАЁН ПАДРЫХТАВАНЫ ДА СЯЎБЫ

Прарывы, выкрытыя „Зьвяздой“, ліквідаваны

ХОЙНІКІ. (Па тэлеграфу). На 1 красавіка пад калгасамі ў раёне занята 49.432 гэкт. —70 проц. плошчы раёну. Усяго існуе 47 калгасаў, якія аб'ядняюць 3.230 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, г. зн. 50 проц. гаспадарак раёну.

На новы статут с.-г. арцелі пераведзены ўсе калгасы.

Калгасьнікам раздана па аднэй карове, вернута дробная жывёла. У 5 калгасах жывёла засталася абагуленай з тэй прычыны, што калгасьнікі пастанавілі не разьбіраць жывёлы, лічачы больш мэтазгодным не абагуліць.

Групы беднаты арганізаваны ў большасьці калгасаў. У іншых яны зараз арганізуюцца. 35 груп беднаты працуюць здавальняюча. Разгортваньню працы груп беднаты ў радзе калгасаў перашкаджае адсутнасьць падрыхтаваных кіраўнікоў.

Усе калгасы ўжо зямляўпарадкаваны. 26 калгасам выдзелена ўся плошча і паказан яравы клін. 20 калгасам выдзелен толькі яравы клін.

Бядняцка-серадняцкім гаспадаркам, якія не ўвайшлі ў калгасы, яравы клін паказан амаль ва ўсіх сельсаветах. Падзел яравога кліну для індывідуальнага сэктару ўжо скончаны сельсаветамі ў 50 проц. вёсак.

Абагулена ў калгасах **2.978 галоў рабочае скаціны.** *Грубымі кармамі жывёла забясьпечана. Не хапае 8.000 пудоў аўсу.*

У калгасах абагулена 695.547 кір. насеньня —60 проц. патрэбнасьці. На складзе райкалгассаюзу, акрамя таго, ёсьць 442 тоны насеньня. Такім чынам, трэба лічыць, што раён забясьпечаны насеньнем на ўсе 100 проц., за выключэньнем насеньня культурных траў. Не хапае 70 сявярак.

Ужо ажыцьцёўлен рад мер, якія забясьпечваюць арганізаваны выхад у поле. Рабочыя пляны складзены па ўсіх калгасах. Інвэнтар адрамантаваны. Рабочая сіла праінструктавана.

Форма аплаты па бальшасьці калгасаў яшчэ ня вызначана. Гэтае пытаньне зараз прапрацоўваецца.

Простае насеньне абменена на чыста гатунковае ў разьмеры 90 проц. заданьня.

У адным з саўгасаў раёну арганізуецца машына-трактарная калёна. Ужо атрымана 5 трактараў. Аднак, сьвяркі да гэтага часу яшчэ ня прысланы.

Аббылося 15 пробных выездаў ў поле.

Плян пашырэньня яравое плошчы даведзен да асобнага індывідуальнага двара ў 50 проц. сельсаветаў. Ільготы па новым с.-г. падатку папулярызаваны ў 12 сельсаветах.

Настрой большай часткі калгасьнікаў бадзёры.

Індывідуальныя бядняцкія гаспадаркі інвэнтаром забясьпечаны. Калгасам дана дырэктыва аказаць максымальную дапамогу індывідуальным бядняцкім гаспадаркам у часе сяўбы.

Дырэктывы партыі і ўраду даведзены да шырокіх мас. У апошнія дні наглядаецца прыліў у калгасы беднякоў і сераднякоў, якія раней ня ўступалі ў калектывы.

Сакратар райпарткому **Аўласенка.**

* * *

Тэлеграма сакратара Хойніцкага райкому КП(б)Б і загадчыка райза аб выніках першых дзён праверкі падрыхтаванасьці раёну да сяўбы сьведчыць, што Хойніцкі раён за кароткі час дасягнуў значных вынікаў.

Калі ўлічыць факты і даныя, якія прыводзяцца ў тэлеграме, дык трэба канстатаваць, што Хойніцкаму раёну ўдалося стаць у рады раёнаў, якія ўжо добра падрыхтаваны да веснавое сяўбы.

Мы гэта канстатуем з асаблівым здавальненьнем, бо, як вядома, месяц-паўтара таму назад Хойніцкі раён значна адставаў у падрыхтоўцы да сяўбы ад іншых раёнаў БССР.

Выкрытыя «Зьвяздой» асобныя прарывы ў працы раённых арганізацый і агэнэральная праверка дапамаглі Хойніцкаму раёну ня толькі ліквідаваць гэтыя прарывы, але і палепшыць усю працу наогул у большасьці калгасаў раёну.

Мы просім хойніцкія раённыя арганізацыі паведамляць нам, якім шляхам яны дабіліся гэтых посьпехаў для таго, каб практыку Хойнікаў перанесьці на другія раёны. Мы чакаем таксама ад рабочых брыгад і актывістых-сельскораў падрабязных паведамленьняў аб посьпехах, дасягнутых Хойнікамі ў галіне падрыхтоўкі да сяўбы.

Дадатковыя ільготы калгасьнікам складуць 2.000.000 руб.

Апублікаваная пастанова ЦК УсеКП(б) аб ільготах калгасам азначае дадатковыя вельмі буйныя палягчэньні для калгасаў у дадатак да тых значных ільгот, якія вызначаны новым законам аб с.-г. падатку.

Паводле новага закону, калгасы атрымоўвалі скідку з падатку толькі за прырост жывёлы, цяпер-жа — па 2 гады будзе вызваляцца ўся абагуленая жывёла, што ўжо ў гэтым годзе па Беларусі дасць зьмяншэньне падатку па сацыялістычным сэктары сельскае гаспадаркі каля 500.000 руб.

Значэньне ільгот, вызначаных пастановай ЦК УсеКП(б), узмацняецца тым, што яны ўстаноўлены на 2 гады.

Такім чынам, калгасы, прыбытковасьць якіх значна ўзрастае да будучага году, будуць плаціць падатак значна меншы ў адносінах да свае прыбытковасьці, чым, напр., заплаціць сёлета.

Жывёла, якая знаходзіцца ў індывідуальным карыстаньні членаў калгасаў, таксама вызваляецца ад абкладаньня на працягу 2-х год. Гэта азначае скідку з падатку па БССР у суме каля 300 тысяч рублёў, звыш тых 500.000 руб., на якіх зьменшаны падатак для калгасаў.

Асабліва важна, што калгасы вызваляюцца ад аплаты даўгоў па канфіскаванай кулацкай маемасьці, перададзенай калгасам. Паводле няпоўных даных НКФ БССР, толькі па 5 акругах з кулацкіх гаспадарак, маемасьць якіх перадана калгасам, лічыцца нядоімак па адным с.-г. падатку каля 500.000 руб. Паводле ранейшага законапалажэньня, калгасы павінны былі заплаціць гэтыя нядоімкі поўнасьцю. Цяпер-жа яны вызваляюцца ад аплаты іх.

Калі ўлічыць яшчэ 50-процантную скідку для абагуленых гародаў і гародных калгасаў, зьяўляцца запазычанасьці па зямляўпарадкаваньні, розных штрафаў і спагнаньняў, зьвязаных з невыкананьнем с.-г. павіннасьцяй і г. д., накладзеных да 1-га красавіка 1930 г., дык агульная сума ільгот, паводле пастановы ЦК УсеКП(б) будзе складаць па лініі Наркамфіну па БССР каля 2 млн. руб.

НКФ БССР даў месцам рад паказаньняў аб шырокай папулярызацыі гэтых ільгот. Будзе выпушчана дадатковая агітлітаратура.

М. К.

Папулярызаваць ільготы калгасьнікам

У гутарцы з нашым супрацоўнікам намесьнік старшыні Белкалгасцэнтру т. Сьмірноў сказаў:

— Апублікаваная ўчора ў «Зьвязьдзе» пастанова ЦК УсеКП(б) аб ільготах для калгасаў мае вялізарнейшае значэньне, у прыватнасьці ў той частцы, якая датычыць адходніцтва.

У калгасах БССР становішча з адходніцтвам на сёньняшні дзень стаіць вельмі дрэнна, бо калгасьнікі не выказваюць зацікаўленасьці да адходніцтва, ня ведаючы яго ўмоў.

У некаторых мясцох, акрамя таго, наглядаліся факты недапушчальна вялікіх адлічэньняў з зарплаты адходнікаў калгасьнікаў — у непадзельны фонд калгасаў.

У Калінкавіцкім раёне, Мазырскай акругі, напрыклад, з заработку адходнікаў адлічвалася 40-50 проц. У іншых акругах БССР былі выпадкі, калі адлічвалася 20-30-40 проц.

Гэтыя разьмеры адлічэньня фактычна зрываюць арганізацыю адходніцтва, адбіваючы ў калгасьнікаў усякую ахвоту ісьці на адходныя промыслы.

У пункце «б» § 4 пастановы ЦК УсеКП(б) гаворыцца аб тым, каб «абавязаць праўленьні калгасаў не перашкаджаць калгасьнікам, жадаючым у вольны ад работ у калгасе час, працаваць на абагуленых калгасных конях на возцы, лесазагатоўчых і іншых работах»...

Гэтая пастанова набывае асаблівае значэньне і ў нас, у БССР, паколькі наглядаўся рад выпадкаў простай перашкоды калгасьнікам працаваць на лесазагатоўках і інш. Былі выпадкі, калі такіх калгасьнікаў абвяшчалі «дэзэртырамі» і ўсяк іх ігнаравалі.

Перад калгаснымі і каапэрацыйнымі арганізацыямі і зямельнымі органамі стаіць важнейшая задача — шырока растлумачыць калгасьнікам гэтую пастанову ЦК УсеКП(б).

Арганізацыі павінны прыняць усе меры, каб правільна арганізаваць працу ў калгасах і папулярызаваць ідэю адходніцтва, растлумачыўшы шырокім масам калгасьнікаў яго выгады.

Зараз праводзіцца агляд арганізацыі працы ў калгасах. Трэба гэты агляд выкарыстаць і для праверкі пастановы адходніцтва ў калгасах і для папулярызацыі пастановы ЦК УсеКП(б).

ТЭЛЕГРАМА т. ГЕЮ

У ЦК КП(б)Б на імя тав. Гея атрымана наступная тэлеграма:

«Мы, калгасьнікі Барысаўскага прыгараднага калгасу «Маяк сацыялізму», у ліку 157 сем'яў абагуліўшы насеньне, інвэнтар і коняй на 100 проц. і тавара-прадукцыйную жывёлу —па 97 проц., у дзень пробнага выезду ў поле запэўняем вас і ЦК КП(б)Б, што ў адказ на вылазкі паны рымскага і кулацка-варожых элемэнтаў унутры нашай краіны загад нашай партыі і савецкай улады аб сваячасовым і 100-проц. абсеяньні палёў выканаем па-бальшавіцку».

Калгас «Маяк сацыялізму».

Зрух ёсьць, але посьпех яшчэ не забясьпечаны

Генэральная праверка палепшыла падрыхтоўку Дубровеншчыны да сяўбы

ДУБРОЎНА. (Па тэлеграфу). Першыя дні генэральнай праверкі падрыхтаванасьці Дубровенскага раёну да сяўбы значна палепшылі становішча. Дасягнут пэўны зрух ва ўсіх галінах працы. Гэта характарызуецца наступнымі лічбамі:

Зараз у Дубровенскім раёне налічваецца 57 калгасаў на плошчы 15.672 гэкт. Калгасы займаюць 11.894 гэкт. ворнай зямлі, або 32 проц. агульнай плошчы зямлі ў раёне. Калектывізавана 1.740 гаспадарак—22 проц. агульнай колькасьці гаспадарак раёну.

На новы статут с.-г. арцелі ўжо пераведзен 51 калгас. Рэшта калгасаў будзе пераведзена ў бліжэйшыя два дні.

Батрацка-бядняцкія групы арганізаваны пры 16 калгасах, але праца іх яшчэ нездавальняючая.

Зямляўпарадкаваны 31 калгас—70 проц. плошчы калгасаў. Праца па зямляўпарадкаваньні значна ўзмоцнена. У сельсаветы пасланы яшчэ каморнікі. Да 10 красавіка будзе скончана зямляўпарадкаваньне ва ўсіх калгасах.

Коняй у калгасьнікаў улічана 1.471. Абагулены-ж усяго 442 кані. Кармамі можна будзе забясьпечыць толькі палову абагуленай рабочай скаціны. Абагуленымі плугамі калгасы забясьпечаны на 90 проц., баронамі—на 100 проц., збруяй—на 90 проц.

У 18 калгасах складзены рабочыя пляны. Складаньне плянаў у іншых калгасах праводзіцца ва ўдарным парадку.

Падрыхтоўка індывідуальнага сэктару да сяўбы ўсё яшчэ нездавальняючая. За апошнія 7 дзён плян пашырэньня засеўнай плошчы і правядзеньне агрыкультурных мерапрыемстваў даведзены ў 70 проц. вёсак. Новы закон аб с.-г. падатку папулярызаваны ў 50 проц. вёсак.

Агульная падрыхтоўка да сяўбы, бязумоўна, палепшылася, але яна яшчэ не забясьпечвае арганізаванага выхаду ў поле.

Праверачная камісія і рабочыя брыгады, якія працуюць у калгасах, будуць функцыянаваць да пачатку сяўбы.

Райправерком: Ванхадла, Бурка.

Памылкі выпраўляюцца

ЧАВУСЫ. (Па тэлеграфу). Арганізаваная генэральная праверка падрыхтаванасьці да сяўбы ўжо дала канкрэтныя вынікі. Гэта сьцьвярджаецца наступным становішчам, якое зараз наглядаецца ў раёне.

Пад калгасамі занята 11.000 гэкт. пахані—20 проц. агульнай плошчы пахаці ў раёне. Арганізаваныя 43 калгасы пераведзены на новы статут. Яны аб'ядняюць 1.100 гаспадарак—13 проц. гаспадарак раёну. Ужо зямляўпарадкавана 59 проц. плошчы калгасаў.

Перагібы выпраўляюцца шляхам папулярызацыі апошніх дырэктыў партыі і ўлады сярод насельніцтва. Перавод калгасаў на новы статут быў праведзены на аснове поўнай добраахвотнасьці.

Групы беднаты арганізаваны ў 17 калгасах. Батракоў калектывізавана 38.

Яравы клін для беднякоў і серадняко́ў, якія ня ўвайшлі ў калгасы, ужо адведзены на 6 сельсаветах. Па астатніх 11 сельсаветах гэта праца будзе скончана да 10 красавіка.

Рабочая жывёла ў калгасах абагулена на 35%. Корму не хапае: 374 тоны сена і аўсу. Насеньнем калгасы забясьпечаны на 70 проц. Простымі прыладамі калгасы будуць забясьпечаны пры ўмове выкананьня плянаў завозу жалеза для рамонту с.-г. інвэнтару.

Плян пашырэньня пасеўнай плошчы даведзены да асобнага двара. Новы закон аб с.-г. падатку папулярызаваны.

Сродкамі вытворчасьці, працоўнай дапамогай беднота, якая не ўвайшла ў калгасы, поўнасьцю не забясьпечана.

Саўгасы да сяўбы падрыхтаваны.

У раёне адчуваецца вялікая нястача цягавай сілы.

Сакратар Чавускага РК КП(б)Б МАЛДАВАНАЎ.

Пробны выхад у поле выявіў усе недахопы

У радзе калгасаў Гарадоцкага раёну гэтымі днямі былі наладжаны пробныя выезды ў поле. Выезды паказалі, што калгасы больш-менш падрыхтаваны да сяўбы. У калгасе імя Крупскай у пробным выезьдзе прымала ўдзел 25 аратых. Амаль увесь сельска - гаспадарчы інвэнтар і збруя аказаліся ў поўнай спраўнасьці. Усе калгасьнікі разьбіты на брыгады. Устаноўлена здзельная аплата працы. Пасьля пробнага выезду тры гаспадаркі падалі заявы аб прыёме ў калгас.

Калгас імя Дзяржынскага падрыхтаваўся да сяўбы. Насеньне амаль ўсё абагулена і ачышчана. С.-г. інвэнтар адрамантаваны. Усё гэта было выяўлена і праверана пры арганізацыі пробнага выезду ў поле.

Пробны выхад у поле калгасаў «Чырвоны Пуцілавец» і «Чырвонаармеец» паказаў, што калгасы рыхтаваліся да сяўбы. С.-г. інвэнтар адрамантаваны. Насеньне абагулена. Абодва калгасы пераведзены на новы статут с.-г. арцелі.

Пасьля пробных выездаў у калгас «Чырвонаармеец» уступіла 15 гаспадарак.

У калгасе «Чырвоны Гарадок» у пробным выезьдзе прымала ўдзел 30 аратых. С.-г. прылады, збруя былі спраўныя.

Арганізацыі Аршаншчыны, зацікаўцеся тым, што робіцца ў Чарэйшчыне

Матар'ялы брыгад, якія выехалі ў сельсаветы Чарэйскага раёну, Аршанскае акругі, гавораць аб тым, што раён яшчэ далёка не падрыхтаваны да сяўбы.

На 28 сакавіка становішча было такое. Значная частка калгасаў не пераведзена на новы статут і не зямляўпарадкавана. Яравы клін бядняцка - серадняцкім гаспадаркам, што не ўвайшлі ў калгасы, не паказаны. Плян пашырэньня засеўнай плошчы не даведзены нават да вёскі, не таварочы ўжо аб даведзеньні яго да асобнага двара. У большасьці месц ільготы па с.-г. падатку не папулярызуюцца. І гэта ў той час, калі сяўба тут ужо пачынаецца (адзін з калгасаў ўжо выйшаў у поле араць).

Тэмп пераводу калгасаў на новы статут вельмі марудны. Акруговыя арганізацыі — Калгасаюз, Паляводсаюз — бюракратычна адносяцца да запатрабаваньняў раёну.

У Калінкавіцкім раёне, Мазырскай акругі, напрыклад, з заработку адходнікаў адлічвалася 40-50 проц. У іншых акругах БССР былі выпадкі, калі адлічвалася 20-30-40 проц.

Гэтыя разьмеры адлічэньня фактычна зрываюць арганізацыю адходніцтва, адбіваючы ў калгасьнікаў усякую ахвоту ісьці на адходныя промыслы.

У пункце «б» § 4 пастановы ЦК УсеКП(б) гаворыцца аб тым, каб «абавязаць праўленьні калгасаў не перашкаджаць калгасьнікам, жадаючым у вольны ад работ у калгасе час, працаваць на абагуленых калгасных конях на возцы, лесазагатоўчых і іншых работах»...

Гэтая пастанова набывае асаблівае значэньне і ў нас, у БССР, паколькі наглядаўся рад выпадкаў простай перашкоды калгасьнікам працаваць на лесазагатоўках і інш. Былі выпадкі, калі такіх калгасьнікаў абвяшчалі «дэзэртырамі» і ўсяк іх ігнаравалі.

Перад калгаснымі і каапэрацыйнымі арганізацыямі і зямельнымі органамі стаіць важнейшая задача — шырока растлумачыць калгасьнікам гэтую пастанову ЦК УсеКП(б).

Арганізацыі павінны прыняць усе меры, каб правільна арганізаваць працу ў калгасах і папулярызаваць ідэю адходніцтва, растлумачыўшы шырокім масам калгасьнікаў яго выгады.

Зараз праводзіцца агляд арганізацыі працы ў калгасах. Трэба гэты агляд выкарыстаць і для праверкі пастановы адходніцтва ў калгасах і для папулярызацыі пастановы ЦК УсеКП(б).

Калькі пахаці зараз знаходзіцца пад калгасамі, раённыя працаўнікі ня ведаюць. З 30 калгасаў рабочыя пляны арганізаваны толькі ў 7-мі.

Індывідуальныя гаспадаркі беднякоў і серадняко́ў, якія ня ўступілі ў калгасы, не зямляўпарадкаваны. Нічога ня зроблена для папулярызацыі агра-мінімуму і ільгот для пашырэньня засеўнай плошчы. Гэта пытаньне яшчэ толькі будзе разглядацца на прэзыдыуме РВК.

Замест таго, каб па-бальшавіцку выправіць памылкі і энэргічна ўзяцца за практычную падрыхтоўку да выхаду ў поле, паасобныя мясцовыя работнікі, каб замазаць дапушчаныя імі перагібы, імкнуцца ўскласьці ўсю віну на... новы статут. З гэтымі яўна антыпартыйнымі разважаньнямі трэба весьці самую рашучую барацьбу.

Брыгадзіры «Зьвязды» МІНОВІЧ і ХАЛЯВІН.

ЗМАЦАВАНЬНЕ ДЛЯ ДАЛЕЙШАГА НАСТУПЛЕНЬНЯ

Апублікаваная ўчора пастанова ЦК УсеКП(б) аб ільготах для калгасаў зьявіцца магутным сродкам замацаваньня посьпехаў і створыць умовы для працягу шырокага і забясьпечнага наступленьня на фронце калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы. Нельга абмежавацца толькі голым растлумачэньнем будучых пераважнасьцяй буйное калектыўнае гаспадаркі перад дробнай. Трэба, каб сярэдняе сялянства і вясковая беднота ўжо цяпер, сёньня, рэальна адчулі перавагі калгасаў не наогул, а перавагі для сябе ў калгасе параўнаўча з індывідуальнымі гаспадаркамі.

Правыя прыхільнікі тэорыі «самацёку» могуць колька ім будзе ўгодна, даводзіць, што такія вялікія ільготы роўнамоцны парушэньню прынцыпу добраахвотнасьці. Яны тым самым выкрыюць толькі сваё поўнае неразуменьне ленінскай добраахвотнасьці ў калгасным руху. Ленін гаварыў:

«Кожны грамадзкі лад узьнікае толькі пры фінансавым падтрыманьні пэўнае клясы. Няма чаго напамінаць аб тых сотнях мільёнаў рублёў, якія каштавала параджэньне «свабоднага» капіталізму. Цяпер мы павінны прызнаць, што ў сучасны момант той грамадзкі лад, які мы павінны падтрымліваць звыш звычайнага, ёсьць лад каапэрацыйны».

Фінансаваньне пануючай клясай—пралетарыятам новага «грамадзкага ладу», калгасна-каапэрацыйнага ладу, ёсьць выкананьне аднаго з асноўных ленінскіх палажэньняў. Галавацяпствам, галавакружэньнем ад посьпехаў і часткова палітычнай правакацыяй трэба вытлумачыць тую энэргію, якая ў многіх мясцох была выказана ў справе спагнаньня ўсякай запазычанасьці, усякай недаімачнасьці і ўсякага роду ўзносаў, па-за ўсякім улікам платаздольнасьці ледзь-ледзь яшчэ арганізаваўшыхся калгасаў і калгасьнікаў.

Забараняючы практыку прымусовага збору паявых капіталаў і мэтавых укладаў у крэдытныя таварыствы і каапэрацыю, пастанова здымае з калгасьнікаў запазычанасьць па зямляўпарадкаваньні, штрафы і судовыя спагнаньні, зьвязаныя з невыкананьнем сельска-гаспадарчых павіннасьцяй, нядоімак і г. д. Вялікія ільготы атрымліваюць калгасы і калгасьнікі па падатковым абкладаньні.

Поўнае вызваленьне ад падаткаў усе рабочае, прадукцыйнае і дробнае жывёлы ў калгасах як абагуленай, так і той, што знаходзіцца ў індывідуальным уладаньні калгасьнікаў, побач з вялікімі ільготамі па абкладаньні гародаў у калгасах стварае для сярэдняга сялянства і беднаты вялізныя перавагі іх гаспадарчай дзейнасьці ў калгасах у параўнаньні з індывідуальным гаспадараньнем.

Асабліва трэба адзначыць вызваленьне ад падатку прадукцыйнай і дробнай жывёлы, якая знаходзіцца ў індывідуальным уладаньні калгасьнікаў. Гэта ільгота будзе асабліва блізка і зразумела сярэдняму сялянству.

Калі да ўсяго гэтага дадаць пацьвярджэньне пастановы ЦК ад 5 студзеня аб крэдытаваньні калгасаў у гэтым годзе ў разьмеры 500 млн. рублёў, і калі прыняць пад увагу, што партыя зробіць усё для правядзеньня гэтае пастановы ў жыцьцё, стане відавочным вялізнае палітычнае значэньне пастановы аб ільготах для калгасаў.

Заслугоўвае вялікай увагі пастанова аб наданьні калгасьнікам магчымасьці працаваць на грамадзкіх конях, на ізвозных, лесазагатоўчых і інш. работах з атрыманьнем у сваю карысьць ад 40 да 50 проц. заработнай сумы (у залежнасьці ад таго, чый корм) ад такіх работ.

«Калгасы зьяўляюцца адзіным сродкам, які дае сялянам выхад з галечы і цемры» (Сталін). «Таму савецкая ўлада будзе даваць калгасам ільготы і перавагу перад адзіноасабовымі гаспадаркамі. Гэта значыць, што яна будзе даваць калгасам ільготы і ў сэнсе перадачы зямлі, і ў сэнсе забесьпячэньня машынамі, трактарамі, насенным збожжам і г. д., і ў сэнсе палягчэньня ападаткаваньня, і ў сэнсе выдачы ім крэдытаў». (Сталін).

Гэтыя ільготы на даным этапе калгаснага руху, побач з іншымі мерапрыемствамі, павінны прыпыніць адліў з калгасаў, стварыць тыя ўмовы для замацаваньня ўнутры калгасаў асноўных калгасных кадраў і для стварэньня ўмоў для прыліву новых і звароту выбыўшых калгасьнікаў.

Крэдыт і ільготы калгасам маюць выключнае вытворчае значэньне іменна сёньня, у разгар сяўбы на поўдні і падрыхтоўкі палявых работ на ўсёй астатняй тэрыторыі краю. Таму пастанова ЦК аб ільготах павінна быць безадкладна растлумачана кожнаму калгасьніку, кожнаму выбыўшаму і кожнаму не ўступіўшаму яшчэ ў калгас бядняцка-серадняцкаму двару.

Калі артыкул т. Сталіна «Галавакружэньне ад посьпехаў» і пастанова ЦК ад 15-га сакавіка аб скрыўленьні лініі ў калгасным руху зьнімалі «асноўныя тормазы» калгаснага руху, абвяшчаючы жорсткую барацьбу з перагібамі і скрыўленьнямі, дык пастанова ЦК аб ільготах для калгасаў і «адказы таварышам калгасьнікам» т. Сталіна зьвяцца тым гістарычным лёкаматывам, які, упэўнена і паступова разьвіваючы тэмп, пасуне суцэльную калектывізацыю ўперад па шляхох, ачышчаных ад заносаў, скрыўленьняў і перагібаў.

Навучаная практыкай папярэдняга руху, моцна падмацаваная ільготамі і пралетарскімі крэдытамі суцэльная калектывізацыя, як рух беднаты і сярэдняга сялянства да сацыялізму, пад кіраўніцтвам пралетарыяту, паслужыць рашаючым этапам сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, працягне і давядзе да канца пачатую справу ліквідацыі кулацтва, як клясы.

(«ПРАВДА»).

Калгасьнікі ўступаюць у рады партыі

БАРЫСАЎ. Канфэрэнцыя калгасьнікаў Міатчанскага кусту, якая гэтымі днямі адбылася, зьяўляецца яскравым доказам правільнасьці лініі партыі ў галіне калектывізацыі і, у прыватнасьці, апошніх дырэктыў ЦК аб неадкладным выпраўленьні дапушчаных памылак і скажэньняў.

Абмеркаваньне пляну правядзеньня палявых работ праходзіла пры выключнай актыўнасьці калгасьнікаў, якія ўносілі рад дзелавых прапаноў.

Перад канцом канфэрэнцыі рад калгасьнікаў падалі заявы аб прыёме ў рады партыі.

Канфэрэнцыя абвясьціла сябе ўдарнай на правядзеньні веснавой сяўбы.

ЛАБУНСКІ.

Да суровай адказнасьці

Генэральная праверка падрыхтоўкі да сяўбы, распачатая рэдакцыяй газэты «Зьвязда» разам з ЦКК-РСІ і Наркамземам, выявіла, што рад калгасаў Вульскага раёну (Полаччына) слаба падрыхтаваны да сяўбы.

Выяўлен рад скажэньняў лініі партыі пры арганізацыі калгасаў. Быў нават выпадак, калі беднякоў і серадняко́ў, якія не жадалі ўступіць у калгасы, высялялі ў Баранкаўскі сельсавет на балоты і пяскі. Пры гэтым складаліся дна сьпісы: адзін з тых, якія жадалі ўступіць у калгас, і другі на высяленьне.

20 серадняцкіх гаспадарак, якія адмовіліся ўступіць у калгас, былі раскулачаны. Зараз гэта грубая памылка выпраўляецца.

Вульскія прышыбеевы нічога не рабілі для замацаваньня арганізаваных калгасаў. Групы беднаты ў калгасах ня былі арганізаваны. Калгасы фактычна існавалі на паперы. Кіраўнікі Вульскага раёну дасылалі ў акругу «рэляцыі» аб 80 проц. калектывізацыі раёну, што зусім не адпавядала сапраўднасьці.

Аграмаладзь зараз знаходзіцца пад калгасамі, раённыя працаўнікі ня ведаюць. З 30 калгасаў рабочыя пляны арганізаваны толькі ў 7-мі.

Індывідуальныя гаспадаркі беднякоў і серадняко́ў, якія ня ўступілі ў калгасы, не зямляўпарадкаваны. Нічога ня зроблена для папулярызацыі агра-мінімуму і ільгот для пашырэньня засеўнай плошчы. Гэта пытаньне яшчэ толькі будзе разглядацца на прэзыдыуме РВК.

Замест таго, каб па-бальшавіцку выправіць памылкі і энэргічна ўзяцца за практычную падрыхтоўку да выха

Пленум ЦК КП(б)Б

Заключнае слова т. ГЕЯ пры закрыцьці пленуму

Таварышы, мы не маглі ў парадак дня нашага сёнешняга пленуму ўключыць некаторыя пытаньні, якія ў цяперашні час трэба было-б абмеркаваць. Мы выходзілі пры складаньні парадку дня нашага пленуму з неабходнасьці як мага менш часу затрымаць таварышоў з месц, у якіх праходзіць зараз надзвычай важная работа на мясцох. Я думаю, аднак, што пры закрыцьці работы пленуму трэба было-б сказаць некалькі слоў аб тым, што перад намі стаіць задача падрыхтаваць да падыходзячых перавыбараў партыйнай арганізацыі і да падыходзячага зьезду нашай партыі; вам трэба па месцох зараз пры правядзеньні перавыбараў партыйных органаў падвесьці агульныя вынікі работы камуністычнай партыі бальшавікоў Беларусі, не абмяжоўваючыся, зразумела, тымі пытаньнямі, якія стаялі на парадку дня нашага сёнешняга пленуму, але падагуліць становішча змаганьня з правым ухілам, які складаў асноўную небясьпеку на даным этапе нашага будаўніцтва, змаганьня, якое партыя правяла з вялікім посьпехам. Вам прыдасьцца падагуліць вынікі работы і змаганьня з нацыянал-дэмакратызмам, які сваімі карэньнямі цясьнейшым чынам зьвязаны з правааапартуністычнай установкай. У змаганьні з нацыянал-дэмакратызмам партыя таксама мае цэлы рад посьпехаў, і вялікае прасоўваньне наперад.

Вам прыдасьцца пры падагульненьні вынікаў работы партыйнай арганізацыі сур'ёзна спыніцца і на такім пытаньні, як пытаньне разьвіцьця самакрытыкі і правядзеньня ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, аднэй з аснoўных задач работы нашай партыя, якую Цэнтральны Камітэт і пізавыя парторганізацыі ажыцьцяўляюць і павінны ажыцьцяўляць з усёй пасьлядоўнасьцю.

Сёнешнія пастановы, пастановы данага пленуму, які сабраўся якраз па пераломным, на вельмі цяжкім моманце разьвіцьця нашай работы па вёсцы, даюць асноўныя ўстаноўкі па буйнейшых гаспадарча-палітычных задачах партыі. Мне здаецца, што вынікі работы нашага пленуму ў пытаньні калектывізацыі могуць быць у самым кароткім, у самым сьціслым відзе зьведзены да таго, што нашай бліжэйшай задачай зьяўляецца арыентаваць партыю на безагаворачнае, пасьлядоўнае правядзеньне дырэктывы партыі аб добраахвотнасьці ў калгасным будаўніцтве; зламаць супраціўленьне тых, што супраціўляюцца, перакананць растлумачэньнем тых, хто не разумее гэтай дырэктывы партыі, і ажыцьцявіць правільную палітыку ў справе калгаснага будаўніцтва. Пры гэтым могуць быць і будуць настроі, якія сыгналізуюць аб іншай небясьпецы. Аб гэтай другой небясьпецы вельмі добра і ўдала гаворыць рэзалюцыя апошняга пленуму Маскоўскага камітэту партыі:

«Побач з гэтым, пленум Маскоўскага камітэту адзначае праяўленьне замяшанасьці ў некаторых партыйных арганізацыях, адыход ад актыўнай работы па замацаваньні дасягнутага ўжо, адыход, які зьяўляецца ні чым іншым, як дэзэртырствам з фронту змаганьня з кулацтвам. Учарайшыя галавацяпы і «левыя» загібшчыкі сёньня гатовы аддаць поле змаганьня кулаку, які прабуе разбурыць саўгасы і калгасы і сарваць сяўбу, абарачаючыся тым самым у тыповых выяўнікаў дробна-буржуазных хістаньняў, у рупар дробна-буржуазнай стыхіі і саюзьнікаў правых апартуністых».

На даным этапе у гэтым канкрэтным пытаньні, як і ва ўсіх задачах партыі, нам трэба сыстэматычна змагацца таксама на два фронты: змагацца супроць тых, хто супраціўляецца правядзеньню лініі партыі, хто супраціўляецца выпраўленьню сваіх памылак, змагацца супроць папікёраў, якія апускаюць рукі, пакідаюць поле бойкі бяз бою кулаку.

Пастановы пленуму па пытаньнях прамфінпляну даюць зусім ясную ўстаноўку па цэлым радзе пытаньняў, ад якіх залежыць уздым актыўнасьці рабочых мас, разьвіцьцё ўдарніцтва і сацыялістычнага спаборніцтва, правядзеньне ў жыцьцё пастановы аб бесьперапыцы і пераход на 7-мігадзінны рабочы дзень, правядзеньне ў жыцьцё пастаноў аб адзінапачальні і рад іншых указаньняў, якія ёсьць у рэзалюцыі, даюць правільную кіруючую лінію для пастаноўкі работы нашай прамысловасьці.

Гэтыя вынікі данага пленуму натуральна ўвойдуць, як часьць, у агульна-падрыхтоўчую работу партыі да падыходзячых партыйных канфэрэнцый і падыходзячага зьезду партыі.

Дазвольце на гэтым абвясьціць пасяджэньне пленуму закрытым.

Да фрунзаўскай раённай рабочай канфэрэнцыі

Вялізарны ўздым нашай індустрыі, асабліва цяжкай, стварыў неабходную базу для сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. Асноўныя масы сялянства пераканаліся, што выхад з галечы, з «ідыётызму вясковага жыцьця» можна знайсьці толькі на шляху сацыялістычнага разьвіцьця вёскі.

На аснове росту індустрыі, на базе суцэльнае калектывізацыі мы атрымалі магчымасьць перайсьці да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як класы. Для ўсіх відаочны нашы посьпехі, нашы дасягненьні ў гэтай галіне.

Тэзэры правых ухілістых самім жыцьцём разьбіты дашчэнту. Рабочая кляса і яе партыя, узяўшы высокія тэмпы ў галіне індустрыялізацыі і калектывізацыі, атрымліваюць перамогу за перамогай. Партыя вуснамі тав. Сталіна ня ўтойвае і таго, што наш пераможны рух у галіне калектывізацыі вёскі закружыў многіх галаву. Замест арганізацыі бядняцка-серадняцкіх мас у калгасы на аснове добраахвотнасьці, як гэтага заўсёды партыя патрабавала, у цэлым радзе месц мы маем перагібы ў бок адміністраваньня. На практыцы выявіліся поўныя скажэньні лініі партыі. Усе гэтыя «левыя» перагібы льлюць фактычна ваду на млын правых ухілістых, якія зьяўляюцца атэнтарам кулацтва ў радах партыі.

Мы павінны весьці самую жорсткую барацьбу з гэтымі перагібамі і скажэньнямі лініі партыі за замацаваньне і далейшае разьвіцьцё калгаснага руху. Кулацтва распачала зьверскі супраціўляецца. Нашы гаспадарчыя посьпехі, палітыка ліквідацыі кулацтва, як класы, на базе суцэльнай калектывізацыі, выклікае лютую нянавісьць сусьветнай буржуазіі. Мы жывем у абстаноўцы самай заядлай і лютай падрыхтоўкі вайны супроць СССР.

Адсюль і выцякаюць надзвычай важныя і адказныя задачы, што паўстаюць перад раённай беспартыйнай канфэрэнцыяй рабочых **Фрунзаўскага** раёну, як часткі ўсяе рабочае класы.

Аднэй з галоўных гарантый, якія забясьпечваюць непераможнае будаўніцтва сацыялізму зьяўляецца выкананьне нашай пяцігодкі ў найбольш кароткі тэрмін. За першы год пяцігодкі, як уся прамысловасьць, так і ўсе прадпрыемствы нашага раёну выканалі свае вытворчыя заданьні са значным перавышэньнем. Першае паўгодзьдзе 1929—30 году паказвае некаторае недавыкананьне прамфінплянаў. **Такія заводы, як «Дрэва-апрацоўшчык»**, футравая, галянтарэйная фабрыкі ня выканалі сваіх заданьняў.

Выкананьне і перавышэньне плянавых заданьняў—вось вакол чаго мы абавязаны мабілізаваць усю актыўнасьць рабочых праз яшчэ больш шырокае разьвіцьцё сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Шматлікія рабочыя брыгады прынялі практычны ўдзел у калектывізацыі сельскае гаспадаркі. Практыка непасрэднае працы рабочых раёнаў павінна быць на гэтай канфэрэнцыі абагулена. Мы павінны выявіць і рэзка крытыкаваць усе нашы недахопы і перагібы, каб з большай сілай узяцца за выкананьне апошніх дырэктыў партыі ў галіне калектывізацыі. У вёсцы на пастаянная рабоце знаходзіцца каля 100 рабочых на шчата раёну. На канфэрэнцыі трэба праверыць іх работу, уменьне ажыцьцяўляць пралетарскае кіраўніцтва сацыялістычнай перабудовай вёскі. Самая бязьлітасная барацьба з перагібамі за якаснае замацаваньне калгасаў, за далейшае неаслабнае разьвіцьцё калгаснага руху—гэта наша адказьнейшая задача.

На вылазкі міжнароднага імпэрыялізму рабочыя Савецкага Саюзу заўсёды хутка адказвалі мабілізацыяй сваіх сіл, узмацненьнем пільнасьці.

У перажываны пэрыяд сацыялістычнай рэканструкцыі ўсяе народнае гаспадаркі, дзяржапарат, які павінен непасрэдна праводзіць дырэктывы партыі, павінен прыкаваць да сябе яшчэ больш увагі ўсяе рабочае клясы. Не заўсёды асобныя зьвенні дзяржанарату працуюць на нас, вельмі часта працуюць супроць нас. Бюракратызм, засьмечанасьць апарату чужымі асобамі гэтаму спрыяюць. Дзяржапарат павінен быць узяты пад самы пільны рабочы кантроль. Аднэй з гэтых форм зьяўляецца шэфства рабочых прадпрыемстваў над дзяржапаратам.

Рабочыя Фрунзаўскага раёну першыя пачалі браць шэфства над установамі ў Беларусі. Задачай канфэрэнцыі зьяўляецца правяраць практыку шэфства, зьнішчыць усе недахопы і тормазы, якія ёсьць на шляху шэфства.

Наша партыя моцная і непераможная, дзякуючы сваёй надзвычайна глыбокай сувязі са сваёй рабочай клясай. Посьпехі на франтох гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, якія зьяўляюцца вынікам правільнай генэральнай лініі партыі, вызначылі вялізнае давер'е шырокіх рабочых і працоўных мас да партыі.

Рабочыя, а за імі лепшая частка інтэлігенцыі, ідуць у сваю партыю цэлымі цэхамі і заводамі. Рабочыя ідуць у сваю партыю, каб перамагчы ўсе труднасьці, каб дасягнуць яшчэ больших посьпехаў у галіне сацыялістычнага будаўніцтва.

Раённая беспартыйная канфэрэнцыя, зьяўляючыся адным з форм сувязі партыі з беспартыйнымі масамі рабочых, давядзе свае адносіны да лініі партыі, прадэманструе яшчэ і яшчэ раз сваю глыбокую салідарнасьць з генэральнай лініяй партыі.

Толькі на аснове найшырэйшай самакрытыкі мы здолеем выявіць усе нашы балячкі, якія тармозяць далейшае разьвіцьцё сацыялістычнага будаўніцтва, ня ўтойваць недахопаў і памылак, а падвяргаць іх самай рэзкай, жорсткай пралетарскай самакрытыцы—вось тое, што можа забясьпечыць пасьпяховы вынік раённай беспартыйнай рабочай канфэрэнцыі.

Канфэрэнцыя беспартыйных рабочых раёну яшчэ раз давядзе, што рабочая кляса, якая вядзе за сабою асноўныя масы сялянства, пад кіраўніцтвам ленінскае партыі беспаваротна пойдзе наперад, перамагаючы ўсякія труднасьці, адкідваючы прэч са свайго шляху ўсіх пыцікаў, малавераў, правых ухілістых, найбольш небясьпечных на даным этапе і «гэрояў левай рэвалюцыйнай» фразы, пойдзе наперад за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, якая адзіна правільна вызначае шлях да канчатковай перамогі сацыялізму.

Г. Шпэктараў.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Партарганізацыі павінны растлумачыць працоўным дырэктывы партыі па калектывізацыі

Баявая задача

У артыкулах тав. СТАЛІНА і ў апошніх пастановах ЦК УсеКП(б) паказаны чарговыя задачы партыі па калектывізацыі сельскае гаспадаркі. У гэтых важнейшых палітычных дакумантах даны выразныя дырэктывы па ўсіх асноўных рашаючых пытаньнях калгаснага будаўніцтва, выкананьне якіх(дырэктыў) забясьпечвае пасьпяховы рух наперад справы сацыялістычнай перабудовы вёскі.

Кожная партыйная арганізацыя ў горадзе і на вёсцы павінна шырока папулярызаваць і растлумачыць працоўным масам артыкулы тав. Сталіна і пастановы ЦК УсеКП(б) па пытаньнях калгаснага будаўніцтва. Партыйным арганізацыям трэба разгарнуць агітацыйна-прапагандысцкую работу па растлумачэньні і папулярызацыі гэтых дакумантаў на кожным заводзе і фабрыцы, у горадзе і на вёсцы, у камуне, калгасе, саўгасе.

Пад арганізацыяй, ня трацячы часу, прыступіў да растлумачальнай работы, сыстэматычна растлумачваючы рабочым і батрацка-бядняцка-серадняцкім масам артыкул тав. Сталіна «Головокружение от успехов» і пастанову ЦК УсеКП(б) аб барацьбе са скрыўленьнямі партлініі ў калгасным будаўніцтве.

Аднак, мы ня можам сказаць, што на мясцох УСЕ партарганізацыі і ячэйкі прыступілі да гэтай работы. Весткі з месц сыгналізуюць аб тым, што асобныя партарганізацыі вельмі кепска праводзяць сваю растлумачальную работу. У асобных мясцох партыйныя арганізацыі палец аб палец ня стукнулі, каб растлумачыць і папулярызаваць артыкул тав. Сталіна «Головокружение от успехов» і пастанову ЦК УсеКП(б). Ці варта гаварыць, што дрэнная пастаноўка растлумачальнай работы толькі «стварае глебу для распаўсюджаньня недарэчных чутак, для няправільнага тлумачэньня партыйных пастаноў» («Правда»).

«Такая абстаноўка дазваляе правым і «левым» апартуністым займацца разважаньнямі аб тым, што «ня трэба было браць курс на хуткі тэмп калектывізацыі», што «апошняя пастанова партыі—крок назад, уступка кулаку, адступленьне ад узятага партыяй курсу на калектывізацыю».

З такімі разважаньнямі і настроямі партыя будзе бязьлітасна змагацца з усёй бальшавіцкай непрымірымасьцю, удараючы па іх носьбітах.

Партыйныя арганізацыі павінны рашуча і бязьлітасна выкрываць тых, хто апартуністычна тлумачыць пастановы партыі. Гэта задача яшчэ больш падкрэсьлівае патрэбнасьць глыбока растлумачыць і сыстэматычна прапагандаваць артыкул тав. Сталіна і пастанову ЦК УсеКП(б) сярод працоўных мас гораду і вёскі, прасунуць пастановы ЦК аб калектывізацыі ў масы.

Ва ўчарайшым нумары «Зьвязды» апублікаваны новы артыкул т. Сталіна «Адказы таварышом калгасьнікам» і пастанова ЦК УсеКП(б) аб ільготах калгасам. Відавочна вялізарнейшае палітычнае значэньне артыкулу т. Сталіна і апошняй пастановы ЦК. Гэтыя дакументы павінны быць даведзены да кожнага калгасу, павінны быць шырока растлумачаны рабочым і батрацка-бядняцкім і серадняцкім масам. Такая важнейшая задача стаіць перад кожнай арганізацыяй КП(б)Б. У гэтым напрамку мы маем простую дырэктыву Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б.

Гэта дырэктыва Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б павінна быць поўнасьцю выканана. Партыйныя арганізацыі павінны разгарнуць найшырэйшую растлумачальную работу пад лёзунгам—пастановы ЦК аб калектывізацыі—у масы.

ПАРТХРОНІКА

Менскі АК КП(б)Б даў дырэктыву ўсім РК і ячэйкам дакладна прапрацаваць на партсходах артыкул тав. **Сталіна:** «Адказы таварышом калгасьнікам» і пастанову ЦК УсеКП(б) аб ільготах калгасам.

* * *

У парткалектыў **Белдзяржкунівэрсытэту** паступілі заявы ад прафэсароў т. т. **Вальфсона** і **Кроля** аб прыёме іх у партыю.

⊙ Учора рэдакцыя **«Зьвязды»** выпусьціла другі нумар **«Зьвязда» — у калгасы»** з артыкулам тав. **Сталіна: «Адказы т. т. калгасьнікам»** і пастановай ЦК УсеКП(б) аб ільготах калгасам. «Зьвязда» — у калгасы» выпушчана ў колькасьці 50.000 экз.

⊙ 4-га красавіка рэдакцыяй «Зьвязды» паслана ўсім акруговым карэспандэнтам і брыгадзірам тэлеграма наступнага зьместу:

«Неадкладна паведамце, як папулярызуецца пастанова ЦК УсеКП(б) аб ільготах калгасам і апошні артыкул тав. Сталіна. Як рэагуюць беднякі і сераднякі на гэту пастанову. Падайце канкрэтныя прыклады рэагаваньня».

◆◆◆ РЭЗАЛЮЦЫЯ МЕНСКАГА ПАРТАКТЫВУ ◆◆◆

аб выніках сакавіцкага пленуму ЦК КП(б)Б

Заслухаўшы даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. **Васілевіча** аб выніках сакавіцкага пленуму ЦК КП(б)Б, актыў Менскай арганізацыі цалкам і поўнасьцю далучаецца да гэтых пастаноў.

Пленум ЦК праходзіў пад знакам праверкі нашай работы, па ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і ліквідацыі кулацтва, як класы, па разгортваньні веснавой пасеўнай кампаніі ў сацыялістычным сэктары, а таксама індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках, пад знакам праверкі нашай работы ў галіне выкананьня прамфінпляну.

Актыў канстатуе, што буйныя дасягненьні партыі ў справе ажыцьцяўленьня генэральнай ленінскай лініі былі магчымы толькі на аснове жорсткай барацьбы з праваапартуністычным ухілам, як галоўнай небясьпекай у сучасны пэрыяд і «левымі» скажэньнямі партыйнай лініі, толькі на аснове найшырэйшай мабілізацыі рабочае клясы і батрацка-бядняцка-серадняцкіх мас на ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

У выніку вялізарнай работы па індустрыялізацыі краю, па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, ліквідацыі кулацтва, як клясы, і па ўзмацненьні кіруючай ролі пралетарыяту ў вёсцы аўтарытэт і давер'е з боку бядняцка-серадняцкіх пластоў вёскі да партыі ўзьняўся на нябывалую вышыню.

Бядняцка-серадняцкія масы сялянства страцілі веру ў магчымасьць разьвіцьця ўласных індывідуальных гаспадарак і яскрава сабе ўявілі, што адзінай формай сельскай гаспадаркі, якая забясьпечыць уздым матар'яльнага і культурнага ўзроўня, зьяўляецца калектыў — гэта зьяўляецца лепшым довадам таго, што «асноўны паварот вёскі да сацыялізму, гаворачы словамі т. Сталіна, можна ўжо лічыць забясьпечаным».

Адначасова актыў адзначае, што работа па масавай калектывізацыі ў радзе месц суправаджвалася перагібамі і скажэньнямі правільнай партыйнай лініі, адміністраваньнем, перагібамі, накіраванымі супроць серадняка, спробамі пераскочыць адразу праз сельска-гаспадарчую арцель да камуны. Усё гэта, а імэнна: хістаньні сераднякоў, узмацненьне палітычнае актывізацыі кулацтва, адсутнасьць работы з батрацтвам і беднатой, слабае замацаваньне тэмпаў калектывізацыі, перагібы і скрыўленьні, прывяло да ўзмацненьня хістаньня сярод серадняцтва і да адліву часткі сераднякоў з калгасаў.

У зьвязку з частковым адлівам серадняка з калгасаў, узмацненьнем палітычнай актыўнасьці кулацтва, паасобныя няўстойлівыя і нявытрыманыя элементы партыйнай арганізацыі, якія ня вераць ў здольнасьці пралетарыяту весьці за сабой асноўныя масы сялянства па шляху сацыялістычнай перабудовы, ня бачачы і не разумеючы шляхоў для выпраўленьня дапушчаных імі скажэньняў, замяшаліся і ўпалі ў паніку.

Гэтыя папікёрска-капітуляцкія элементы ўнутры партыі выдаюць гэтыя скажэньні за лінію партыі, стваравуць «тэорыю» аб неабходнасьці адступленьня, аб неабходнасьці адмаўленьня ад калектывізацыі, стваравуць тэорыі «разьвіцьця самацёкам» сельскай гаспадаркі.

Актыў заклікае партарганізацыю да наглыбленай працаўокі пастаноў ЦК УсеКП(б), ЦК і Мен. АК КП(б)Б і артыкулу т. Сталіна, да самай рашучай барацьбы супроць папікёрскіх, апартуністычных элементаў, да неадкладнай ліквідацыі замяшаньня, да бязьлітаснай барцьбы супроць гэтых капітуляцкіх настроў, супроць правага апартунізму і «левых» загібаў.

Актыў адзначае, што, кіруючыся рашэньнямі і дырэктывамі ЦК УсеКП(б), артыкулам т. Сталіна, які своячасова паставіў перад партыяй рад пытаньняў, паўстаўшых у працэсе калгаснага будаўніцтва, ЦК і Мен. АК КП(б)Б на падставе ўліку канкрэтных абставін своячасова завастрыў увагу партыйнай арганізацыі на неабходнасьць узмацненьня барацьбы супроць скажэньняў партыйнай лініі ў галіне калгаснага будаўніцтва.

Актыў канстатуе, што ў тых мясцох, дзе ў ажыцьцяўленьне дырэктыў ЦК, партыйныя арганізацыі правілі рашучую барацьбу супроць перагібаў, супроць скажэньня партлініі, дзе ўзмацнілі работу сярод батрацтва, беднаты, асабліва сярод жанчын, неравялі калгасы на новы статут, узмацнілі змаганьне з кулацтвам, узмацнілі партыйнае кіраўніцтва і гаспадарча-арганізацыйную работу ў калгасах, адзначаецца новы прыліў у калгасы беднякоў і сераднякоў.

Адзначае, што для забясьпячэньня далейшага замацаваньня калгаснага руху і далейшага яшчэ больш пасьпяховага разгортваньня індустрыялізацыі краіны, узмацненьня абароназдольнасьці яе вялізарнае значэньне мае веснавая пасеўная кампанія.

Падрыхтоўка і правядзеньне веснавой пасеўкампаніі праходзіць у абставінах жорсткай клясавай барацьбы. Кулак прабуе сарваць мерапрыемствы партыі па правядзеньні пасеўкампаніі.

Актыў заклікае партарганізацыю да напружаньня ўсіх сіл для пасьпяховага правядзеньня веснавое бальшавіцкай сяўбы ў саўгасах, калгасах, а таксама ў індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках да пашырэньня пасеўнай плошчы і да жорсткага адпору кулакам, які прабуе сарваць мерапрыемствы партыі.

Пленум ЦК пры дапамозе рашучага бальшавіцкай самакрытыкі, ўскрыў прычыны недастатковага выкананьня асноўных якасных і колькасных паказьнікаў прамфінпляну.

Актыў заклікае партыйную арганізацыю да накіраваньня ўсіх сіл на ліквідацыю прарываў у прамфінпляне і яго перавыкананьня, узмацняючы разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, як найлепшых мэтадаў у выкананьні і перавыкананьні задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Актыў заклікае партыйную арганізацыю да далейшай, яшчэ больш жорсткай барацьбы супроць правага апартунізму, супроць «левых» загібаў ад партыйнай лініі, да далейшай яшчэ больш напружанай работы па замацаваньні посьпехаў у галіне калектывізацыі, да неадкладнага пераводу калгасаў на новы статут, правядзеньне ў іх гаспадарчага ўпарадкаваньня, арганізацыі працы і вытворчасьці, да яшчэ больш напружанай работы па ўзмацненьні палітычнай ролі батрацтва і беднаты,—адзінай моцнай апоры рабочае клясы на вёсцы, па давядзеньні да канца раскулачваньня раённаў суцэльнай калектывізацыі, ні ў якім разе не закрапаючы інтарэсаў сераднякоў, прыцягваючы іх да сацбудаўніцтва, на бальшавіцкім правядзеньні веснавой сяўбы і на пасьпяховым выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну.

Далейшае разгортваньне сацыялістычнага наступленьня, выкарчоўваньне карэньняў капіталізму, пасьпяховае разгортваньне калгаснага будаўніцтва і індустрыялізацыі краю ўзмоцніць нашу абароназдольнасьць, што будзе лепшым адказам сусьветнаму капіталу, які вядзе шалёную падрыхтоўку да ўзброенага нападу на бацькаўшчыну сусьветнага пралетарыяту — краіну саветаў.

Не прапрацавалі

Парткалектыў с.-г. акадэміі не папулярызуе важнейшых дырэктыў партыі па пытаньнях калгаснага будаўніцтва.

Артыкул тав. Сталіна і новы статут с.-г. арцелі па партыйных сходах зусім не прапрацоўваліся. Зусім не абмеркаваны пастановы ЦК аб рабоце сярод беднаты і пастанова бюро ЦК КП(б)Б аб ходзе калектывізацыі ў БССР.

Ня дзіва, што сярод асобных студэнтаў ёсьць зусім памылковыя, палітычна-шкодныя думкі «аб зьмене палітыкі партыі», аб тым, што «партыя адступае» і г. д., і г. д. Некаторыя партыйцы нават проста заяўляюць, што «артыкулу тав. Сталіна ня варта было друкаваць у прэсе».

Тое, што бюро парткалектыву акадэміі не забясьпечыла правядзеньня растлумачальнай работы, зьяўляецца яго грубай палітычнай памылкай. Гэта памылка павінна быць безадкладна выпраўлена.

Б.

ПАРТКАЛЕКТЫЎ БДУ ДА ПЕРАВЫБАРАЎ

Работа парткалектыву БДУ была накіравана на паскарэньне падрыхтоўкі сяцыялістых, узмацненьне палітычнага і ідэялёгічнага выхаваньня студэнцтва і барацьбу на ідэялёгічным фронце за пралетарызацыю БДУ.

Мы маем пералом у акадэмічнай рабоце. Акадэмработа пераведзена на рэйкі сацыялістычнага спаборніцтва, скарочаны тэрмін навучаньня на ўсіх факультэтах, парткалектыў правёў работу па рашучай барацьбе са шкодным ідэялёгіяй у выкладаньні некаторых навуковых працаўнікоў.

БДУ папоўніўся марксыцкімі сіламі, праведзена рацыяналізацыя ў акадэмрабоце, некаторыя курсы пэдфаку пераведзены на мэтад актыўнага выкладаньня.

Аднак, у акадэмрабоце яшчэ ня ўсё добра. Мы маем факты супраціўленьня новым мэтадам, факты фармальных адносін да сацспаборніцтва і г. д. Самакрытыка ня стала мэтадам штодзеннай акадэмработы.

Але мы яшчэ маем у наяўнасьці слабае кіраўніцтва акадэмвучобай і спаборніцтвам, няма пастаяннай праверкі акадэмпасьняховасьці камуністых.

Самакрытыка разгорнута слаба. Ёсьць яшчэ думкі, што крытыкаваць можна незаўсёды, што крытыка і самакрытыка гэта права і абавязак толькі партыйцаў, што крытыкаваць наогул ня варта.

Парткалектыў БДУ рашуча ўдарыў па антыпартыйных настроях і разважаньнях асобных камуністых, якія заяўлялі, што «партыя адступае», што «ранейшы курс партыі ў пытаньнях калектывізацыі быў вельмі рашучым» і г. д.

Парткалектыў павінен і надалей рашуча змагацца за генэральную лінію партыі. Асноўнай задачай калектыву зьяўляецца разгортваньне крытыкі і самакрытыкі і перабудова партыйнай, прафэсыянальнай і акадэмічнай работы для таго, каб хутчэй выканаць дырэктывы партыі па падрыхтоўцы кадраў.

Р. Г. ЭПШТЭЙН.

Толькі мяркуюць...

Парткалектыў **абутковай** фабрыкі не праводзіць ніякай работы на растлумачэньні апошніх пастаноў партыі на калгасным будаўніцтве.

На фабрыцы была праведзена гутарка, на якой прысутнічала ня больш 50 рабочых, між тым, на фабрыцы працуе звыш 700 рабочых і работніц.

Аб стане калектывізацыі ў падшэфным раёне ніхто з партыйцаў і рабочых ня ведае. У раён была паслана брыгада з 7 чалавек, але брыгадзіры не азнаёмілі рабочых з вынікамі сваёй работы. Усё мяркуюць заслухаць справаздачу брыгады, разгарнуць растлумачэньне пастаноў партыі па калектывізацыі, але пакуль што далей меркаваньняў справа ня ідзе.

Р.

П. Корчык

Рэвалюцыйны ўздым і нашы актуальныя задачы

Мы ўступілі ў фазу новага рэвалюцыйнага ўздыму ў Зах. Беларусі, у фазу ўздыму рэвалюцыйнай актыўнасьці пралетарыяту і працоўных мас сялянства, абвостранай барацьбы супроць фашыстоўскай акупацыі, — фазу, **якая беспасрэдна вядзе да вялікіх рашаючых клясавых баёў.**

Гэты рэвалюцыйны ўздым зьяўляецца сустаўной часткай таго агульнага завастрэньня рэвалюцыйнай сытуацыі, якое адбываецца на грунце глыбокага эканамічнага крызісу ва ўсіх капіталістычных краёх, паказальнікам чаго ў першую чаргу зьяўляецца шалёны ўзрост беспрацоўя. Крызіс выяўляе ўсю гніласьць і хісткасьць капіталістычнае сыстэмы, абвастрае да нябывалых яшчэ разьмераў клясавыя супярэчнасьці, прыводзіць да вялікіх і вострых клясавых баёў, якія расхістваюць падваліны клясавага панаваньня буржуазіі. Гаспадарчы крызіс і абвастрэньне рэвалюцыйных баёў у капіталістычных краёх, побач з тігантскімі посьпехамі сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР, якое пакідае ззаду ўсе вызначаныя пяцігодкай тэмпы, асабліва ў галіне сацыялістычнае перабудовы вёскі на падставе калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, на аснове суцэльнай калектывізацыі, — нячувана абвастрае супярэчнасьці паміж капіталістычным сьвятам і бацькаўшчынай міжнароднага пралетарыяту, высоўвае на першы плян, ужо як канкрэтную актуальную беспасрэдную нагрозу, **узброены напад міжнароднага імпэрыялізму на СССР.** Шляхам імпэрыялістычнае вайны сусьветны капітал прабуе знайсьці выхад з тых супярэчнасьцей, якія ўзрываюць капіталістычную сыстэму. Сьведчыць аб гэтым шалёны тэмп узбраеньняў, ліхаманкавы тэмп ваенных падрыхтовак і арганізацыі антысавецкага блёку, брудная хваля антысавецкай кампаніі, на чале якое стаў «крыстовы намесьнік на зямлі» — рымскі папа, побач з запраўдамі сацыял - фашыстоўскага II Інтэрнацыяналу. Падрыхтоўка да вайны супроць СССР ідзе побач з далейшай фашызацыяй дзяржаўнай сыстэмы бадай ва ўсіх краёх, далейшым удасканаленьнем фашыстоўскага дзяржаўнага апарату, абвастрэньнем тэрору супроць камуністычных партый і рэвалюцыйнага пралетарыяту. Усё гэта выразна сьведчыць, што **мы стаімо напярэдадні новых вялікіх клясавых баёў —рашучых баёў паміж капіталам і працоўнымі масамі на чале з пралетарыятам, пад кіраўніцтвам сусьветнай камуністычнай партыі — Камінтэрну.**

Рэвалюцыйны ўздым у Зах. Беларусі, як і ва ўсёй Польшчы, зьяўляецца вынікам таго глыбокага працэсу паляпшэньня рабочае клясы і працоўных мас сялянства, які шпарка ідзе ўперад на грунце прымаючага катастрафічны характар гаспадарчага крызісу, усе цяжары якога ўзвальваюцца капіталам на плечы працоўных мас.

У Зах. Беларусі гаспадарчы крызіс набывае асабліва вострыя формы: бадай, поўнасьцю спынена праца ў тэкстыльнай, будаўнічай, гарбарнай галінах прамысловасьці; адзін за другім зачыняюцца тарговкі, сгараючыя ліку рабочых ахапляюць хэмічныя, тытунёвыя і інш. фабрыкі. Беспрацоўе расьце з дня на дзень і ахапіла ўжо **большасьць** рабочае клясы Зах. Беларусі: Вільня налічвае звыш 8.000, а Беласток — 10.000 беспрацоўных. Гэты стан капіталістыя выкарыстоўваюць для ўзмацненьня эксплёатацыі, патаршэньня ўмоў працы пад пагрозай скарачэньня і лёкаўтаў, для ўзмацненьня націску капіталістычнай рацыяналізацыі.

Зямельны голад, крызіс сельскай гаспадаркі, хранічныя недароды і фашыстоўская зямельная палітыка дашчэнту руйнуюць бядняцкія і серадняцкія масы вёскі. Голад і беспрацоўе ахапілі ўсю Зах. Беларусь, стваравучы спрыяючыя ўмовы для поўнага закабаленьня праз абшарнікаў, кулакоў і асадзікаў с.-гаспадарчага пралетарыяту і сялянскай беднаты (выкідваньне з фальваркаў сталых рабочых, зьніжэньне зарплаты, увядзеньне прыгонных умоў працы праз адработкі за жабрачыя «дапамогі» галадаючым і інш.).

Усё ўзрастаючыя падатковыя цяжары, якія ў першую чаргу выклікаюцца ліхаманкавай падрыхтоўкай вайны супроць СССР, разд рознастайных паніжэньняў для тэй-жа мэты (шарваркі)—прысьпяшаюць працэс руйнаваньня працоўных мас. Вызваляючы ад падаткаў абшарнікаў і капіталістых, фашыстоўскі ўрад тым з большай жорсткасьцю спатаняе падаткі, нядоімкі, пазыкі, штрафы з працоўных мас. Падатковыя экзэкуцыі, распродаж і ліцытацыі сялянскай маемасьці становяцца штодзённым спосабам спагнаньня падаткаў.

Націск капіталістых і абшарнікаў, націск фашыстоўскай дыктатуры спатыкаюцца з рашучым адпорам з боку пралетарыяту і працоўных мас **сялянства, якія самі пераходзяць да контр-наступленьня, а ўсё часьцей і да выразнага наступленьня супроць пануючае клясы, супроць фашыстоўскай дыктатуры.**

На першы плян высоўваецца **шырокая і магутная хваля руху беспрацоўных,** якая ахапіла ня толькі ўсе важнейшыя цэнтры, але дасягае да самых глухіх куткоў. Выступленьні беспрацоўных, іх масавасьць, баявая актыўнасьць, адпор нападам паліцыі і фашыстоўскіх забастовак, як гэта мела месца ў Вільні, Пінску, Горадні, Слоніме, сьведчаць аб тым, што рэвалюцыйная хваля ўжо пачынае ламаць паліцэйскія рамкі, ужо набірае формы беспасрэднай барацьбы супроць органаў фашыстоўскай улады. Рад упартых забастовак у трудзейшых абставінах гаспадарчага крызісу і тэрору супроць капіталістычнай рацыяналізацыі, за павышэньне зарплаты і скарачэньне рабочага дня, супроць эканамічнага і паліцэйскага тэрору, у абарону рэвалюцыйнага прафруху, уцягваньне ў забастовачную барацьбу найбольш адсталых аддзелаў пралетарыяту (забастоўка сэзонных рабочых пры будове чыгункі Друя-Варанаева, забастоўка 600 с.-гаспадарчых рабочых у Кобрынскім раёне), нарастаньне барацьбы чыгуначнікаў, рабочых хэмічнай прамысловасьці ў Горадні і Пінску, рад палітычных забастовак у 12-тыя ўгодкі Кастрычніцкай рэвалюцыі (Вільня, Сарны, Пінск), вымяншэньне ўплываў сацыял-фашыстых і адпор з боку мас іх псэўдаапазыцыйнай фразэалёгіі — яскравы выраз шпаркай радыкалізацыі рабочае клясы і росту яе рэвалюцыйнай актыўнасьці.

Побач з гэтым абвастраецца барацьба працоўных мас сялянства супроць эксплёатацыі абшарнікаў і кулакоў, супроць падаткаў, шарварак, і зямельнай палітыкі фашыстоўскага ўраду, супроць тэрору і нацыянальнага ўціску. Актыўныя выступленьні супроць камасацыі і ліквідацыі сэрвітутаў шырацца і даходзяць да сутычак з паліцыяй; падаткі, нядоімкі і штрафы спагняюцца толькі праз экзэкуцыі, супраціўленьне проці шарварак даходзіць да крывавых сутычак з паліцыяй (Тараспольскі раён); рэвалюцыйная актыўнасьць сялянскіх мас праяўляецца ў многалюдных баявых мітынгах, у адпоры мас наск

Аб новых ільготах для калгасаў і іх членаў

Пастанова ЦВК і СНК СССР

МАСКВА, 4. У мэтах замацаваньня калгасаў і заахвочваньня далейшага росту калектывізацыі ЦВК і СНК СССР пастанавілі:

1. Вызваліць ад адзінага с.-г. падатку на два гады (1930-31 і 1931-32 гады): а) усю абагуленую рабочую жывёлу (коняй, валоў і інш.) у калгасах; б) усіх кароў, авец, сьвіней і птушак як у аграмаджаных калгасах, так і тых, што застаюцца ў індывідуальным уладаньні калгасьнікаў.

2. Пры ападаткаваньні адзіным с.-г. падаткам агародных калгасаў і абагуленых агародаў у іншых калгасах паніжаць нормы прыбытковасьці ў два разы супроць устаноўленых для данай мясцовасьці норм прыбытковасьці гародаў. Плошчу, якая нанова абарачаецца пад абагуленыя гароды, як у гародных, так і іншых калгасах, цалкам вызваліць ад адзінага с.-г. падатку ў працягу двух год.

3. Адпаведна з паказанымі ільготамі агульная сума адзінага с.-г. падатку на 1930-31 г. будзе скарочана.

4. Даручыць народнаму камісарыяту земляробства Саюзу ССР і ўсесаюзнаму с.-г. каапэрацыйнаму калгаснаму банку цалкам забясьпечыць у бягучым годзе крэдытаваньне калгасаў у разьмеры 500 млн. рублёў.

5. Выплату запазычанасьці па крэдытах, якая прыпадае на гаспадаркі, што ўступілі ў калгасы, а таксама якая перайшла на калгасы, растэрмінаваць да 1-га лістапада 1930 г. Растэрміноўка ўстанаўляецца крэдытнымі таварыствамі з тым, каб запазычанасьць пагашалася часьцямі адпаведна з паступленьнем прыбыткаў ад паляводзтва і жывёлаводзтва.

6. Зьняць з гаспадарак, якія ўступілі ў калгасы, запазычанасьць па зямлеўпарадкаваньні, праведзеным да іх уступленьня у калгасы.

7. Зьняць з сялян, якія ўступілі ў калгасы, усе неспагнаныя да выданьня гэтае пастановы штрафы за парушэньне законаў аб падатках і іншыя абавязковыя аплаты за невыкананьне іншых абавязкаў, якія ляжаць на індывідуальнай сялянскай гаспадарцы. Па тых-жа парушэньнях, якія зроблены сялянамі да ўступленьня іх у калгас, спыніць выкананьне судовых прысудаў, якія вынесены да гэтага часу, а таксама спыніць пачатыя справы аб прыцягненьні да крымінальнае і адміністрацыйнае адказнасьці.

8. Вызваліць калгасы ад аплаты запазычанасьці па пераданай ім маемасьці, канфіскаванай у кулакоў.

9. Рашуча забараніць прымусовыя спагнаньні паявых узносаў і паявых укладаў у крэдытныя і іншыя каапэрацыйныя таварыствы. Забараніць таксама прымусовы збор укладаў у касы ашчадкасьці.

10. Спыніць да канца бягучага гаспадарчага году далейшы збор задаткаў на трактары.

11. Забараніць браць на ўбой жывёлу па кантрактацыйных дагаварох цельных кароў і ў аднакароўных гаспадарках, якія ўваходзяць у калгасы. Даручыць народнаму камісарыяту замежнага і ўнутранага гандлю СССР забясьпечыць выкананьне гэтае пастановы.

12. Забараніць адлічэньні ў прыбытак калгасаў ад заработку калгасьнікаў паза калгасам большага процанту, чым гэта ўстаноўлена законам у адносінах да прыбыткаў ад адходных промыслаў (ад 3 да 10 проц. заробку), незалежна ад тэрміну і месца працы.

Абавязаць праўленьні калгасаў не перашкаджаць калгасьнікам, якія жадаюць у вольны час ад працы ў калгасах працаваць на абагуленых калгасных конях на звозных, лесазагатоўчых і інш. работах. У гэтых выпадках 40 проц. заработку калгасьніка ад такіх промыслаў застаецца за калгасьнікам, калі ён карыстаецца кормам, які належыць калгасу, і 60-70 проц., калі ён корміць коняй сваім кормам.

Даручыць Калгасцэнтру забясьпечыць выкананьне гэтае пастановы.

У сувязі з ільготамі ўнесьці ў палажэньне аб адзіным с.-г. падатку ад 23-га лютага 1930 г. адпаведныя зьмены.

У 1936 ГОДЗЕ — НОВАЯ МОРСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ?

Шалёныя ўзбраеньні імпэрыялістых

ТОКІЁ, 2. У тым, што Амэрыцы ўдалося дабіцца на морскай канфэрэнцыі згоды японскага ўраду па амэрыканскую прапанову, па думцы «Ніці-Ніці» і «Цзі-Цзі», значную ролю адыграла зробленая ў лютым прамова амэрыканскага насла Кэстля, у якой ён прыпнаў пераважнае становішча Японіі па Далёкім Усходзе.

Па словах «Ніці-Ніці», блізкай да вайскова-морскіх колаў, няма гарантый таго, што морская канфэрэнцыя адбудзецца ў 1936 годзе.

«Хоці» зазначае на тое, што **да 1936 году Японія фактычна будзе мець 72 проц. буйных крэйсэраў**, аднак, пасьля 1936 году становішча яе пагоршыцца з прычыны таго, што Амэрыка прыступіць да набудовы трох дадатковых крэйсэраў.

«Цзі-Цзі» адабрае пастанову ўраду і непакоіцца толькі па поваду пабудовы Амэрыкай пасьля 1936 году трох крэйсэраў.

У колах міністэрства замежных сраў выклікала хваляваньне паведамленьне «Ніці-Ніці» **аб непасрэдным звароце Макданальда да японскага ўраду з пагрозай супольнага англа-амэрыканскага узмацненьня ўзбраеньняў супроць Японіі, у выпадку яе адмовы ад згоды.** Відавочна, такое-ж паведамленьне было зроблена японскаму ўраду Кэстлем па даручэньні Стымсона.

Англа-французская ваенная ўмова

РЫМ, 3. Як падае «Джорнале д'Італія» Англія і Францыя прыйшлі на лёндонскай канфэрэнцыі да згоды на наступнай аснове: Англія абавязуецца аказваць Францыі на Міжземным моры падтрыманьне ў межах, прадугледжаных статутам Лігі Нацый, Лёкарнскім дагаворам і пактам Кэлёга. У замен гэтага Францыя значна скарачае свой вайсковы флёт; да згоды павінна быць прыцягнута Італія з тым, аднак, што Францыя паранейшаму адхіляе патрабаваньне Італіі аб роўнасьці італьянскага і французскага флётаў. «Джорнале Д'Італія» заяўляе, што згода Англіі на падтрыманьне Францыі роўназначна заключэньню палітычнае ваенна-морскае згоды, якая выходзіць паза межы Міжземнага мора. Газэта катэгарычна заяўляе, што **ня можа быць і гутаркі аб далучэньні Італіі да англа-французкае згоды.**

Збор сродкаў на куплю 40 трактараў для СССР

НЬЮ-ЕРК, 3. Амэрыканскае таварыства прыяцеляў СССР пачало кампанію за стварэньне фонду на пакупку 40 трактараў у падарунак працоўным СССР.

РОСТ ПАПУЛЯРНАСЬЦІ САВЕЦКІХ ІДЭЙ У МАНЧЖУРЫІ

ТОКІЁ, 2. З Харбіна падаюць, што начальнік паліцыі асобнага раёну Усходніх правінцый апублікаваў загад, у якім канстатуецца ўзмацненьне «анты-імпэрыялісцкай, камуністычнай дзейнасьці» сярод кітайскіх рабочых і вучнёўства, распаўсюджаньне рэвалюцыйных лятучак і **рост папулярнасьці савецкіх ідэй у Манчжурыі.** Загад прадпісвае звальняць неблаганадзейных настаўнікаў і непаслухмяных вучняў, устанавіць цэнзуру на пошце і строгі нагляд за насельніцтвам.

Непасрэднай прычынай апублікаваньня загаду зьявіліся дэманстрацыі апошніх дзён 1-га красавіка груца вучняў кітайскіх школ у Харбіне і Фуцзяне наладзіла дэманстрацыю пад лёзунгамі: «Далоў імпэрыялістых», «Далоў прыслужнікаў імпэрыялістых», «Далоў рэакцыйных настаўнікаў». Дэманстранты патрабавалі свабоды сходаў, саюзаў, прэсы і ўвядзеньня курсу сацыяльных навук. Анты-імпэрыялістычны саюз кітайскага вучнёўства выпусьціў лятучкі з заклікам да забастоўкі вучнёўства. Дэманстранты награжалі разграміць кітайскія газэты, якія адмовіліся надрукаваць гэтыя лятучкі, у якіх саюз выказваецца супроць Гаміндану, «Супроць вайны з СССР», які адносіцца да Кітаю, як да роўнага. Сёньня група вучнёўства —дэманстрантаў закідала каменьнямі будынак газэты, якую рэдагуе дарадца Чжан Суэ-ляна.

Пленум эўрапейскага сялянскага камітэту

БЭРЛІН, 3. Учора адбыўся першы пленум эўрапейскага сялянскага камітэту, выбранага першым усеэўрапейскім кангрэсам працоўнага сялянства. Пленум выбраў сакратарыят у складзе 7 членаў і бюро камітэту ў складзе з членаў. Кіраўніком камітэту выбраны **Рыхтэр**, які стаў на чале работы ўсеэўрапейскага камітэту па падрыхтоўцы кангрэсу.

Ліст Ромэна Роляна

МАСКВА, 4 Рэдакцыя «Известий» атрымала з Швэйцарыі ліст ад вядомага пісьменьніка Ромэна Роляна, у якім ён піша:

«Мне робяць гонар апублікаваньнем у СССР поўнага выданьня маіх твораў. Я паведамляю маім расійскіх прыяцеляў аб тым, што я зусім адмовіўся ад усяго аўтарскага ганарару, які мне належаў-быў за творы, якімі я магу распараджацца, пры тым я паставіў умову, што гэтыя сумы павінны быць перераданы цалкам вадавецтвам на бягучы рахунак першага маскоўскага унівэрсытэту. Мне было-б прыемна, каб гэтыя грошы пайшлі на стварэньне фонду па выдачы стыпэндый студэнтам. Такім шляхам я хачу публічна засьведчыць свае брацкія пачуцьці працоўнай моладзі Расіі і маю адданасьць СССР».

Чыстка радоў УсеКП(б) канчаецца 1-га мая

Пастанова прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б)

МАСКВА, 4. Прэзыдыум ЦКК УсеКП(б) пастанавіў скончыць генэральную праверку і чыстку радоў УсеКП(б) 1-га мая 1930 г. Усе камуністыя, якія не зьявіліся на праверку і не паведаміўшыя да 1-га мая ў парткамітэт, ці Кантрольную Камісію аб грунтоўных прычынах няяўкі на праверку, будуць лічыцца мэханічна выбыўшымі з партыі і абавязаны здаць у ячэйку партдакументы. Усе акруговыя і раённыя кантрольныя камісіі павінны не пазьней 15 мая г.г. падаць паіменныя сьпісы незьявіўшыхся на праверку і якія лічацца мэханічна выбыўшымі з партыі. У гэтых сьпісах неабходна паведаміць нумар партдакументу, партстаж, сацыяльнае становішча, занятак, пол і прычыны няяўкі на праверку. Копіі сьпісаў адначасова накіроўваюцца ў ЦКК УсеКП(б).

Абласныя, краёвыя КК і ЦКК нацкампартый абавязаны не пазьней 1-га чэрвеня г.г. прыслаць у ЦК УсеКП(б) лічбовыя зводкі, або весткі аб незьявіўшыхся на праверку.

Сотні навуковых экспэдыцый для вывучэньня багацьцяў СССР

ЛЕНІНГРАД, 3. Пляны экспэдыцыйных досьледаў у гэтым годзе, распрацаваны акадэміяй навук і іншымі навукова-дасьледчымі ўстановамі, прадугледжвае адпраўку вялізнае колькасьці экспэдыцый, атрадаў і партый, а таксама паездак асобных вучоных ва ўсе часьці Саюзу—ад палярных паясоў да высот Пальміру і ад заходняй вобласьці да Японскага мора. Для ўнікненьня паралелізму пляны ўсіх экспэдыцый узгоднены.

Экспэдыцыямі будуць кіраваць акадэмікі Мар, Бартольд, Дарсмон і інш. вялікія вучоныя. Між іншым, у гэтым-жа годзе дасьледваны зусім нявывучаны іспалінскі Мангола-Ахоцкі мэталёны пояс, адлегласьць якога раўна 2.000 кілёмэтраў. У раёне гэтага «пояса» ёсьць багацейшае скапленьне бэрылу, серы, вісмуту, медзі, цынку, серабра, сьвінца, гальфраму і іншых каштоўных выкапняў.

Інстытут Поўначы накіроўвае экспэдыцыю на Паўночную Землю. Геалёгічны камітэт пасылае 150 партый і атрадаў у розныя раёны СССР для разьведкі горных багацьцяў.

ПАБУДОВА ЗАВОДУ КАМБАЙНАЎ У НОВАСІБІРСКУ

ЛЕНІНГРАД, 1. Інстытут па праектаваньні новых машынабудаўнічых заводаў скончыў выкананьне ўдарнага ўрадавага заданьня па складаньні генэральнага праекту Новасібірскага заводу камбайнаў. Завод разьлічаны на штогодны выпуск 25.000 камбайнаў, 30.000 трактарных сявярак і 30.000 касарак. Пабудова заводу разгортваецца ў красавіку і будзе весьціся з такім тэмпам, каб восьнью 1931 г. Новасібірскі гігант ужо ўступіў у строй. Кошт аднаго савецкага камбайну вызначаны ў 3.500 р., касаркі — 102 р., а сявяркі — 291 руб. Агульная каштоўнасьць пабудовы Новасібірскага заводу складае 45 млн. руб. На ім будзе занята 9.600 рабочых

МАСАВАЯ СЯЎБА НА ДОНЕ

ТАГАНРОГ, 2. На Доне разгарнулася масавая сяўба. У большасьці раёнаў прыступілі да сяўбы і індывідуальнікі. Ужо засеяна 400 тыс. гэктараў, што складае 40 проц. пляну. У Ейскім і Старомінскім раёнах плян ужо выкананы на 60 проц.

АРГАНІЗАЦЫЯ ГІГАНЦКАГА КАЛГАСНАГА КАМБІНАТУ

НОВАРАСІЙСК, 2. Складзены праект арганізацыі гіганцкага калгаснага камбінату «Бальшавік» у Чэрлакскім раёне, Омскай акруг. «Бальшавік» зойме плошчу ў 161.000 гэктараў. У камбінат уваходзяць тры магутныя камуны і рад саўгасаў і калгасаў (усяго каля 13.000 чалавек). Камбінат поўнасьцю забясьпечаны цягавай сілаю ёсьць 110 трактароў і 4.000 рабочых коняй. У гэтым годзе камбінат засеяў 40.000 гэктараў.

(РОСТА).

ЗА САМАПРАВЕРКУ!

Неадкладна пачаць масавую праверку выкананьня прамфінпляну, спаборніцтва і ўдарніцтва

Ажыцьцявіць пастанову УсеЦСПС, не чакаючы дадатковых дырэктыў

Давесьці прамфінплян да кожнага рабочага месца

«Зьвязда» ўжо многа раз сыгналізавала аб тым, што прамфінпляны на прадпрыемствах не даведзены да кожнага цэху і да кожнага рабочага. Ня гледзячы на гэта, прафарганізацыі дасюль не зрабілі належных вываду і не ўзмацнілі прапрацоўкі прамфінплянаў у цэхах. Большасьць заўкомаў абмяжоўваецца тым, што на сходах рабочых ставяць даклады адміністрацыі аб прамфінпляне. Рабочыя, выслухаўшы сотні лічбаў і не запамятаўшы ні адной, застаюцца пры сваіх ведах аб прамфінпляне. Прычым, фабзаўкомы ўпэўнены, што рабочыя добра ўсё зразумелі.

— У нас усе рабочыя добра інфармаваны аб плянавых заданьнях — кажа старшыня фабкому Менскай **абутковай фабрыкі тав. Звонак.**

Між тым на фабрыку за апошні час улілося шмат новых рабочых, якія часамі вельмі нядбайна адносяцца да машын і да сваіх абавязкаў.

Сярод рабочых начных зьмен таксама не праводзіцца ніякай растлумачальнай работы. Больш таго, у начных зьменах якраз і працуюць новыя кадры рабочых.

— Вось хутка будуць перавыбары фабкому — кажа старшыня — **тады ўжо перабудуем сваю работу на новых формах і мэтадах.**

Ня лепш стаіць справа і на **Менскім хлебазаводзе.** У заўкоме гаворацъ:

— Ура! Мы столькі сходаў праводзілі, столькі дакладаў дырэктара заслухалі... У нас рабочыя добра ведаюць свой прамфінплян.

А рабочыя кажуць пэадварот:

— Праўда, што сходы праводзіліся, але-ж, каб запісаць нам прамфінплян на паперы і павесіць у цэху, вось тады мы-б у ім памаленьку і разабраліся. А што лічбы? Ніхто іх амаль не зразумеў, бо напісаны яны на бухгальтарскай мове.

Заўком апраўдваецца:

— Цяжка працаваць. У нас старшыні заўкому мяняюцца, як рукавічкі (?!)

Як-бы там ні было, а прамфінплян да цэху ўсё-ж не даведзены.

А. МАНЬКОЎ.

> **„На ўсіх прадпрыемствах і ў буйных цэхах стварыць ЧКК (часовыя кантрольныя камісіі), а ў дапамогу ім у цэхах, зьменах і буйных агрэгатах арганізаваць самаправераччныя брыгады з ударнікаў, з удзелам інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў"**
>
> **(З пастановы прэзыдыуму УсеЦСПС)**

Прамфінплян у... галаве адміністрацыі

Зараз цяжка знайсьці завод, які працаваў-бы без пляну. Але такі завод знаходзіцца ў Менску. Гэта фармазавод.

На запытаньне — ці даведзен у вас прамфінплян да аддзяленьняў?—старшыня заўкому т. Намесьнікава адказала:

— З чым-жа знаёміць рабочых, калі ў нас з чэрвеня мінулага году ўсё абяцаюць скласьці вытворчую праграму, але яе да сёньняшняга дня няма?

— Адміністрацыя ўсё заспакойвае. «Пачакайце, у нас вельмі заблытана бухгальтэрыя, наладзім справу в бухгальтэрыяй, тады возьмемся складаць пляны».

Зразумела, што рабочым цяжка ведаць аб тым, што робіцца ў галаве ў адміністрацыі. Адсутнасьць прамфінпляну дрэнна адбіваецца на працы заводу.

Некаторыя аддзяленьні заводу абвясьцілі сябе ўдарнымі, заключылі сацдагавары. Але ніхто ня ведае, як дагавары выконваюцца, бо кантора заводу не дае ніякіх вестак.

Насьценная газэта некалькі разоў падымала гэтае пытаньне, але адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал кажа — «Ваша справа пісаць, а наша справа пляваць» і ні на адну заметку не адказвае.

ЗОРАВЫ.

Ці выканалі мы нашы абяцаньні?

Рабочыя вагонных майстэрань малога рамонту МББ чыг. ст. Менск, калі ан вяшчалі свае майстэрні ўдарнымі, выслухалі шмат цёплых слоў. Адміністрацыя абяцала даваць сваячасова весткі аб ходзе сацспаборніцтва. Заўком абяцаў сваячасова інфармаваць рабочых аб дасягненьнях і недахопах у рабоце ўдарных брыгад. Але пасьля сходу ўсё пайшло зусім наадваро.

Да сёньняшняга дня рабочыя ня ведаюць, ці выканалі яны свае абяцаньні ці не. Ня ведае аб гэтым навіт старшыня мясцкому № 1.

— Адміністрацыя дала весткі толькі за студзень, а за люты і сакавік яшчэ ня хутка будуць.

Лічбаў аб выкананьні прамфінпляну ў мясцкоме таксама няма. Прышлося найсьці да загадчыка майстэрнямі тав. **Адзінца.** На запытаньне, якую карысьць дало ўдарніцтва, тав. Адзінец ня мог адказаць — «Не падлічвалі, ня ведаем —вось яго адказ.

Зразумела, што калі адміністрацыя мясцком самі ня ведаюць аб выніках сацспаборніцтва і ўдарніцтва, як-ж могуць аб гэтым ведаць рабочыя?

А.

Пасьля добрай нагонкі

На шпалернай фабрыцы імя Варонскага прамфінплян даведзен да кожнага рабочага.

— Пасьля таго, як ЦП саюзу друкароў дало добрую нагонку, мы пачалі знаёміць рабочых з прамфінплянам, так малюе старшыня вытворчай камісіі гісторыю гэтай справы.

Цяпер каля кожнай машыны штодзённа вывешваюцца паказальнікі, колькі рабочы павінен выпрацаваць паводле пляну, якую павінен ён даць якасьці і г. д. Потым лічбы выпрацоўкі заносяцца майстрам цэху на дошцы і такім чынам рабочы мае магчымасьць штодзённа сачыць за посьпехам сваёй работы.

Таму на фабрыцы з выкананьнем прамфінпляну стаіць добра.

РАБОЧЫ.

У 1936 ГОДЗЕ — НОВАЯ МОРСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ?

Шалёныя ўзбраеньні імпэрыялістых

ТОКІЁ, 2. У тым, што Амэрыцы ўдалося дабіцца на морскай канфэрэнцыі згоды японскага ўраду па амэрыканскую прапанову, па думцы «Ніці-Ніці» і «Цзі-Цзі», значную ролю адыграла зробленая ў лютым прамова амэрыканскага насла Кэстля, у якой ён прызнаў пераважнае становішча Японіі па Далёкім Усходзе.

Па словах «Ніці-Ніці», блізкай да вайскова-морскіх колаў, няма гарантый таго, што морская канфэрэнцыя адбудзецца ў 1936 годзе.

«Хоці» зазначае на тое, **што да 1936 году Японія фактычна будзе мець 72 проц. буйных крэйсэраў**, аднак, пасьля 1936 году становішча яе пагоршыцца з прычыны таго, што Амэрыка прыступіць да набудовы трох дадатковых крэйсэраў.

«Цзі-Цзі» адабрае пастанову ўраду і непакоіцца толькі па поваду пабудовы Амэрыкай пасьля 1936 году трох крэйсэраў.

У колах міністэрства замежных сраў выклікала хваляваньне паведамленьне «Ніці-Ніці» **аб непасрэдным звароце Макданальда да японскага ўраду з пагрозай супольнага англа-амэрыканскага узмацненьня ўзбраеньняў супроць Японіі, у выпадку яе адмовы ад згоды.** Відавочна, такое-ж паведамленьне было зроблена японскаму ўраду Кэстлем па даручэньні Стымсона.

Англа-французская ваенная ўмова

РЫМ, 3. Як падае «Джорнале д'Італія» Англія і Францыя прыйшлі на лёндонскай канфэрэнцыі да згоды на наступнай аснове: Англія абавязуецца аказваць Францыі на Міжземным моры падтрыманьне ў межах, прадугледжаных статутам Лігі Нацый, Лёкарнскім дагаворам і пактам Кэлёга. У замен гэтага Францыя значна скарачае свой вайсковы флёт; да згоды павінна быць прыцягнута Італія з тым, аднак, што Францыя паранейшаму адхіляе патрабаваньне Італіі аб роўнасьці італьянскага і французскага флётаў. «Джорнале Д'Італія» заяўляе, што згода Англіі на падтрыманьне Францыі роўназначна заключэньню палітычнае ваенна-морскае згоды, якая выходзіць паза межы Міжземнага мора. Газэта катэгарычна заяўляе, што **ня можа быць і гутаркі аб далучэньні Італіі да англа-французкае згоды.**

Збор сродкаў на куплю 40 трактараў для СССР

НЬЮ-ЕРК, 3. Амэрыканскае таварыства прыяцеляў СССР пачало кампанію за стварэньне фонду на пакупку 40 трактараў у падарунак працоўным СССР.

Замацаваць вынікі месячніка ашчаднасьці

ЗМАГАЦЦА З ПАРУШЭНЬНЯМІ АСНОЎ АШЧАДНАЙ СПРАВЫ

1-га красавіка скончыўся месячнік ашчаднасьці, які быў ужо два разы працягнуты. Якія асноўныя вынікі месячніка, ці зрабіў ён пералом у адносінах мясцовых арганізацый да ашчаднай справы, ці дапамог ён укараненьню ідэй ашчаднасьці ў гушчу працоўных мас?

Перш-на-перш, трэба падкрэсьліць, што **месячнік ашчаднасьці праводзіўся ў пэрыяд вялікай напружанасьці бюджэту**, калі патрабавалася асабліва выразная, асабліва адказная работа ўсяго ашчадна - крэдытнага апарату.

Значэньне месячніка ашчаднасьці, які павінен быў мабілізаваць новыя сотні тысяч рублёў вольных сродкаў насельніцтва для патрэб сацыялістычнага будаўніцтва, **ня было**, як належыць, усьвядомлена **нашымі партыйнымі, прафсаюзнымі і савецкім арганізацыямі.**

Некаторыя арганізацыі недаацанілі значэньня месячніка і не прынялі у ім належнага ўдзелу.

У выніку, заданьне па месячніку выкананa толькі ў разьмеры 17,2 проц.

Данясеньні рабочых брыгад страканяць весткамі аб безадказных, нядбайных, чыста фармальных адносінах некаторых грамадзкіх арганізацый да гэтай кампаніі

Спасылаючыся на «аб'ектыўныя ўмовы» (неабходнасьць праводзіць калектывізацыю, адсутнасьць часу, адсутнасьць вольных сродкаў), мясцовыя арганізацыі проста адмаўляліся ад правядзеньня кампаніі, або афіцыйна адкладвалі яе (Чашніцкі раён, Віцебскай акр., Быхаўскі — Магілеўскай, Пухавіцкі — Менскай, Вульскі раён, Полацкай акругі і г. д.).

Вось два характэрныя прыклады адносін мясцовых працаўнікоў да месячніка ашчаднасьці.

— Няхай вам галава баліць наконт месячніка. Нам гэтым няма часу займацца, — адказаў сакратар **Чырвона-Слабодзкага райкому.**

— Куды вы лезеце з вашай ашчаднай справай, калі тут і так работы на горла, — адказалі працаўніком ашчаднай касы райвыканкомаўцы **Дрыбінскага раёну**, Аршанскае акругі.

Зразумела, што пры такіх настроях месячнік у сельсаветах зусім не праводзіўся.

У сакавіку быў дасягнут некаторы пералом у адносінах мясцовай грамадзкасьці да месячніка, але і да канца сакавіка правядзеньне месячніка па вёсцы не насіла арганізаванага характару, праходзіла бяз удзелу вясковага грамадзкага актыву, бяз увязкі яго з іншымі палітычна - гаспадарчымі кампаніямі.

Трэба адзначыць, што **калгасы і саўгасы ня былі скарыстаны, як апорныя пункты кампаніі на вёсцы.** Агітацыя за ашчадную справу ахапіла толькі нязначную частку калгасаў; ня была дасягнута асноўная мэта месячніка — мабілізаваць у ашчадных касах вольныя сродкі калгасьнікаў.

Месячнік ашчаднасьці праводзіўся ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы; супраціўленьне капіталістычных элемэнтаў знайшло свой адбітак і ў месячніку ў форме шырокай агітацыі кулацтва супроць ашчадных кас. Гэта агітацыя не сустракала спачатку ў паасобных мясцох належнага адпору.

Акруговыя камісіі садзейнасьці дзяржкрэдыту наогул ня справіліся з роляю арганізатара кампаніі. Яны прамаргалі літы і толькі ў пачатку сакавіка тропкі разварушыліся. Полацкая акруговая камісія правяла поўную бязьдзейнасьць; яе прыкладу пасьледавала Віцебская акруговая камісія; Магілеўская камісія да канца лютага ня ставіла нават пытаньня аб месячніку, Мазырская толькі 10-га лютага пачала абмеркаваньне гэтага пытаньня.

Зразумела, што пры такіх адносінах акруговых камісій і пры адсутнасьці кіраўніцтва з іх боку, раённыя камісіі працавалі вельмі слаба, а работа сельскіх камісій зусім не адчувалася.

Адначасова трэба адзначыць, што месячнік ашчаднасьці дапамог узмацненьню сыстэмы камісій садзейнасьці, значна ажыўў работу нізавых камісій у галіне дзяржкрэдыту.

Рабочыя брыгады, якія абсьледавалі становішча на мясцох, адзначаюць, што ў горадзе месячнік ашчаднасьці прайшоў значна лепш, чым на раёнах. Прафсаюзныя арганізацыі ў апошні час заняліся ашчаднай справай. Прафсаюзная маса правяла вялікую актыўнасьць; за 2 месяцы лік укладчыкаў — рабочых і служачых — павялічыўся амаль на 50.000 чал.

Агульныя вынікі месячніка: **ашчадная справа яшчэ дагэтуль не карыстаецца адпаведнай увагай з боку грамадзкасьці; месячнік ашчаднасьці значна дапамог укараненьню ідэй ашчаднасьці ў шырокія масы, якія зразумелі неабходнасьць свайго матар'яльнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве.**

Вынікі месячніка ашчаднасьці павінны быць замацаваны. Трэба дабіцца рэзкага пералому ў тэмпах разьвіцьця ашчаднай справы.

С. М.

Гарэлка — у ролі прапагандыстага ашчаднай справы

У нашай газэце некалькі раз паведамлялася аб выпадках парушэньня асноўных прынцыпаў ашчаднай справы і дзяржкрэдыту, аб прымусовым уцягненьні ўкладчыкаў, аб навязваньні індывідуальных дагавароў з ашчаднымі касамі і г. д.

У пагоні за лічбамі, за фармальным выкананьнем дырэктыў некаторыя нашы арганізацыі зусім парушалі прынцыпы добраахвотнасьці, галавацяпства скажалі правільную лінію ў пытаньнях дзяржкрэдыту.

Асабліва вызначыліся арганізацыі **Гарадоцкага раёну, Віцебскай акругі**, якія парашылі бліснуць новымі, імі самімі прыдуманымі мэтадамі ўцягненьня ўкладчыкаў.

Працаўнікі гарадоцкай ашчадкасы дабіліся пастановы аб тым, што гарэлка ў краме Цэнтрасьпірту прадаецца толькі... укладчыкам ашчадных кас: той, хто не зьяўляецца ўкладчыкам, разам з бутэлькай гарэлкі, атрымлівае ашчадную кніжку.

Як ахарактарызаваць такія мэтады работы?

Лішняе гаварыць аб тым, што вярбоўка ўкладчыкаў, шляхам дапамогі з боку Цэнтрасьпірту, прыносіць вялікую шкоду разьвіцьцю ашчаднай справы і толькі дыскрэдытуе самую ідэю ашчаднасьці. Зусім зразумела, што ашчадная справа павінна спрыяць рацыяналізацыі бюджэту працоўных і, у прыватнасьці, барацьбе з алькагалізмам. Паводле-ж волі гарадоцкіх галавацяпаў, гарэлка стала прапагандыстым ідэй ашчаднасьці.

Трэба рашуча зьнішчаць такія скажэньні правільнай лініі і прыцягваць галавацяпаў да адказнасьці.

ПАЛЕЕС.

На пабудову самалёту „Наш адказ папе Пію XI"

Уносяць і выклікаюць

Рабочыя, служачыя і студэнты сельгастэхнікуму імя Цурупы ў адказ на заклік рымскага папы да крыжовага паходу супроць СССР уносяць 1 проц. свайго заработку на пабудову самалёту «Наш адказ папе Пію XI».

— Рабочыя і служачыя саўгаспадаркі імя Хацкевіча ўносяць аднадзенны заработак у суме 132 р. 80 кап. на пабудову самалёту і выклікаюць усе саўгасы Менскай акругі.

— Працаўнікі Барысаўскай райгарміліцыі ўносяць на пабудову самалёту «Наш адказ папе Пію XI» свой паўдзённы заработак і выклікаюць пасьледваць іх прыкладу ўсіх працаўнікоў міліцыі БССР.

— Працоўныя мястэчка Смалявічы на агульным сходзе пастанавілі адлічыць адзін проц. свайго месячнага заработку на пабудову самалёту «Наш адказ папе рымскаму».

— Прэзыдыум Мазырскага акрсавету Асоавіяхіму ўносіць у фонд «Наш адказ папе рымскаму» 36 руб. і выклікае ўсе прэзыдыумы акрсаветаў Асоавіяхіму БССР.

— Саматужнікі члены арцелі «Согласие» м-ка Плешчаніц уносяць на пабудову танку імя Дзяржынскага 92 руб. 51 кап.

Падрыхтаваць спэцыялістых па с. г.

Ня гледзячы на зусім ясную і канкрэтную пастанову СНК аб рэарганізацыі сельска-гаспадарчай акадэміі, НКА і НКЗ пядбайна, фармальна падышлі да рэарганізацыі структуры с.-г. акадэміі. У іх пастановах зусім зьнік факультэт эканомікі, арганізацыі і плянаваньня сельскае гаспадаркі.

Між тым, патрэба арганізацыі такога факультэту вельмі насьпела. За гэта выказалася ўся маса студэнтаў і навуковых работнікаў акадэміі.

Усякі, хто хоць крыху знаёмы з практыкай будаўніцтва агра-індывідуальных камбінатаў, буйных саўгасаў і калгасаў, ведае, наколькі адчуваецца вострая патрэба ў спэцыялістых-эканамістых сельскай гаспадаркі. Адсутнасьць спэцыялістых-эканамістых—гэта найбольш вузкае месца ў разгорнутым будаўніцтве нашых агракамбінатаў.

Лістападаўскі пленум ЦК УсеКП(б) зусім ясна канстатаваў, што справа з падрыхтоўкай эканамістых стаіць у нас вельмі кепска. Калі так стаіць справа ў галіне прамысловасьці, дзе эканамічная асьвета далёка выперадзіла сельскую гаспадарку, дык у галіне сельскай гаспадаркі справа стаіць куды горш. Ня трэба забываць, што чым больш будзе ісьці працэс аграмаджаньня і стварэньня буйных прадпрыемстваў, тым больш будзе патрэбна спэцыялістых-эканамістых і арганізатараў сельскай гаспадаркі. Вось чаму трэба ўзмацніць да максымальных разьмераў падрыхтоўку такіх спэцыялістых, якія маглі-б быць дырэктарамі агра-індустрыяльных камбінатаў, саўгасаў, кіраўнікамі калгасаў, працаўнікамі ў галіне плянаваньня сельскае гаспадаркі.

Якія-ж патрабаваньні мы павінны прад'явіць у адносінах да падрыхтоўкі такіх спэцыялістых? Мы павінны зьвярнуць найбольшую ўвагу на ўзмацненьне катэдраў і дысцыплін сацыяльна-эканамічных і арганізацыйна-вытворчых, адводзячы ім асноўнае месца ў навучальным плане. Трэба таксама ўзмацніць інжынэрна-тэхнічныя дысцыпліны, як напрыклад, электрыфікацыю сельскай гаспадаркі і мэханізацыю яе (экспляатацыя с.-г. машын, арганізацыя тэхпрадпрыемстваў і г. д.).

Трэба забясьпечыць прыём на факультэт эканомікі таварышоў, якія маюць ужо арганізацыйную практыку буйное вытворчасьці. Зусім ясна, што рабочая прослойка на даным факультэце павінна быць таксама значна ўзмоцнена, у параўнанні з іншымі факультэтамі.

Г. Айзэнбург.

„Рабоче-Крестьянский Корреспондент" — у масы

Кожны рабселькор і насьценгазэта павінны мець сваю часопісь

У Беларусі налічваецца каля 2.000 насьценгазэт у раёнах і каля 1.000 насьценгазэт у гарадох. Акрамя паказаных лічбаў ёсьць звыш 40 друкаваных фабзаводзкіх і калгасных газэт.

Усе рэдкалегіі і рабселькоры патрабуюць пісьмовага кіраўніцтва і паказаньняў у сваёй штодзённай рабоце. А гэтага можна дабіцца праз рабселькораўскія часопісі.

Значная большасьць рэдкалегій зусім ня вынясе кіраўнічых рабселькораўскіх часопісяй, як «Рабоче-Крестьянский Корреспондент», «Селькор» і г. д. Не какарыстаюцца ў большасьці рэдкалегіі матар'ялам з паказаных часопісяй. А гэта кажа за тое, што рабселькоры і рэдкалегіі насьценгазэт ня выконваюць пастановы IV Усесаюзнай нарады рабселькораў у адносінах пашырэньня «Рабоче-Крестьянского Корреспондента». У пастанове 4-й Усесаюзнай рабселькораўскай нарады гаворыцца: **«Распаўсюджаньне «Раб.-Крестьян. Корреспон.» павінна стаць справай усіх рэдакцый газэт, усіх рабселькораўскіх працаўнікоў, рэдкалегій насьценгазэт і саміх рабкораў, селькораў, ваенкораў і насьценкораў, на абавязку якіх павінна ляжаць найлепшае скарыстаньне на сваім прадпрыемстве або ў вёсцы практыкі, якая асьвятляецца ў часопісі, арганізацыі сувязі з «Раб.-Крестьян. Корр.» і прасьвяньня яе ў масы».**

Трэба канстатаваць, што гэта пастанова не праламалася цалкам на ўмовах Беларусі. Аб гэтым гаворыць лічбы. Калі ў Гомелі на першым мясцкоме чыгмайстэрань МББ, дзе працуе 1.900 рабочых, выпісваецца 126 экз. «Р.-К. Корреспондента», то ў Менску справа з выпіскай часопісі стаіць зусім дрэнна. У Менску налічваецца каля 15 розных газэт і часопісяй, звыш 200 насьценгазэт, вялікая армія рабкораў, а часопісь выпісваецца ўсяго... 126 экз.

Гэтыя лічбы к

ПЕРШЫ УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД ФІЗЫЯЛЕГАЎ

28 сакавіка скончыўся Ўсебеларускі зьезд фізыялёгаў. На зьезд прыбылі фізыялёгі, біяхэмікі і фармакалёгі БССР. Прымалі ўдзел у рабоце зьезду і вучоныя з іншых рэспублік нашага Саюзу: акадэмік Паладзін з УССР, праф. Варанцоў, Папоў з РСФСР і іншыя. Усяго на зьезьдзе прымала ўдзел каля 59 асоб.

З прывітаньнем зьезду выступілі прадстаўнікі рабочых заводу «Энэргія», Наркамасьветы і НКАЗ. Упрывітаньнях было адзначана, што індустрыялізацыя краіны, сацыялістычная рэканструкцыя сельскае гаспадаркі патрабуюць ад навукі ва ўсіх яе галінах шырокай дапамогі сацыялістычнаму будаўніцтву.

У прывітаньні ад НКА і Акадэміі Навук УССР акадэмік **Паладзін** падкрэсьліў вялікае значэньне 1-га Ўсебеларускага зьезду, які навінен палажыць пачатак арганізаванай і плянамернай навукова-дасьледчай працы фізыялёгаў, біяхэмікаў і фармакалёгаў БССР. Апрача таго, акадэмік Паладзін асьвятліў контр-рэвалюцыйную сутнасьць «СВУ». Зьезд аднадушна вынес пратэст супроць контр-рэвалюцыйных дзеяньняў «СВУ».

Праф. Колнікаў падрабязна асьвятліў анты-савецкую палітыку папоў і кэсандоў усіх масьцей, на чале з «намесьнікам Хрыста» Піем. XI. Зьезд заклікаў усіх навуковых працаўнікоў, у адказ на «крыжовы паход», яшчэ больш згуртавацца вакол камуністычнае партыі, яшчэ шпарчэй узмацняць тэмп індустрыялізацыі, яшчэ больш энэргічна прасоўваць навуку ў масы.

У сваім дакладзе на тэму «Фізыялёгія і дыялектычны матэрыялізм» праф. **Выдра** завастрыў пытаньне мэтадалёгіі ў галіне прыродазнаўства наогул і ў фізыялёгіі, у прыватнасьці. Ён на прыкладах адзначыў няжыцьцёвасьць тэорый мэханістых і віталістых.

На працягу двух дзён на зьезьдзе было заслухана каля 30 навуковых дакладаў, у якіх былі закрануты цікавыя і навукова-каштоўныя пытаньні.

Ф. К.

ПАБУДОВУ ДОМУ УРАДУ --ПАД ГРАМАДЗКІ КАНТРОЛЬ

Пабудова Дому Ўраду праходзіць пад грамадзкім кантролем. На агульна-гарадзкім сходзе інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў, які быў скліканы па ініцыятыве РБ ІТС саюзу будаўнікоў (на сход зьявілася мала спэцыялістых), аўтар праекту архітэктар **Лянгбард** дэманстраваў сваю работу ў канчатковым выглядзе.

Спэцыялістыя, якія прысутнічалі на сходзе, упэўніліся ў тым, што ціперашні канчатковы праект лепшы за першапачатковы эскізны.

Будынак вызначаецца надзвычайнай прастатой і харастом форм. Асабліва прыгожая заля пасяджэньняў ЦВК, якая адзначаецца сваёй канструкцыяй і афарбоўкай.

На гэтым сходзе інжынэр Шнэйдэр паведаміў аб падрыхтоўчай рабоце па арганізацыі ў Доме Ўраду мэханічнай сувязі паміж наркаматамі і ўнутры іх. Па думцы дакладчыка, рацыяналізацыя вытворачага працэсу патрабуе расплянаваньня будынку ня ў выглядзе асобных ячэек (рабочых памяшканьняў), а ў выглядзе апэрацыйных заляў пакшталт цэхаў. Плян будынку ў поўнай меры дазваляе перайсьці да падобнай сыстэмы арганізацыі працы.

Судакладчык ад Белдзяржбуду паведаміў аб ходзе работы па пабудове фундаманту будынку і арганізацыі далейшай працы.

Праект 2-га красавіка будзе разгледжан на пасяджэньні СНК.

КУЛЬКІН.

МЕНСК

Ад ЦКК НК-РСІ

З прычыны новых акалічнасьцяй, калегія НК-РСІ БССР пастанавіла адмяніць сваю пастанову ад 31-га кастрычніка мінулага году аб прыцягненьні да адказнасьці за ненармальнасьці з хлебнымі перавозкамі старшыні праўленьня МББ чыг. тав. **Арнольдава** і старшыні праўленьня Заходніх чыгунак тав. **Навумава.**

Да адказнасьці за пераманьваньн супрацоўнікаў

НК-РСІ БССР запрапанаваў органам Наркампрацы ўзмацніць барацьбу з пераманьваньнем супрацоўнікаў з аднэй установы ў другую, прыцягваючы вінаватых да судовай адказнасьці.

За незаконныя павышэньні ставак зарплаты пастаўлена на від б. нам. старшыні ВСНГ тав. БАЛЮ, старшыні Белсельтрэсту тав. ХРЫСАНФАВУ і галоўбуху САРАГАЎЦУ.

За пераманьваньне працаўніка пастаўлена на від загадчыку Белсельснабу тав. ТАЛАПІЛЕ.

Спынены абсьледваньні фабрык і заводаў

Прэзыдыум ЦКК НК-РСІ пастанавіў забараніць усім арганізацыям і ўстановам у пэрыяд з 1-га красавіка па 1-га мая рабіць абсьледваньні фабрык і заводаў распуліканскае прамысловасьці. Забарона выклікана самаправеркай выкананьня прамфінпляну і дагавораў па сацспаборніцтве, якая праводзіцца на прадпрыемствах.

Дырэктыва аб пасылцы членаў гарсавету на вёску ня выканана

Згодна пастановы прэзыдыуму ЦВК БССР, гарсаветы павінны былі паслаць на пастаянную работу ў сельскія саветы 200 членаў гарсаветаў — рабочых. Гарсаветы паслалі 202 чалав., але з гэтай колькасьці членаў гарсавету ўсяго толькі 51.

Такім чынам, дырэктыва прэзыдыуму ЦВК выканана няпоўнасьцю. Здавальняюча і поўнасьцю выканалі дырэктыву толькі Мазырскі, Полацкі і Рагачоўскі гарсаветы.

Сакратарыят ЦВК даручыў гарсаветам дадаткова паслаць членаў гарсаветаў добраахвотнікаў для пастаяннай работы ў сельскіх саветах.

60 сьвінаводных саўгасаў у БССР

У Менск прыехаў прадстаўнік усесаюзнага сьвінаводнага трэсту для прыёмкі саўгасаў, якія перадаюцца трэсту для разьвіцьця сьвінагадоўлі.

Белсельтрэст-жа мяркуе перадаць сьвінаводнаму трэсту 50-60 саўгасаў.

У гэтым годзе ў БССР будуць выдаткаваны значныя сумы на разьвіцьцё сьвінагадоўлі.

Савет Працы і Абароны на гэты год ужо вызначыў для БССР 5-6 млн. руб.

Будуць пабудаваны спэцыяльныя сьвінухі, разьлічаныя на 50 тысяч сьвіней-матак.

Мэддапамога--у часе веснавой сяўбы

НК Аховы Здароўя прапанаваў усім раённым органам аховы здароўя і камітэтам Чырвонага крыжу прыняць практычны ўдзел у веснавой засеўнай кампаніі. Для аказаньня тэрміновай мэдычнай дапамогі ў часе веснавой сяўбы прапанавана раённым камітэтам Чырвонага крыжу арганізаваць брыгады сёстраў і заблысьпечыць іх патрэбнымі мэдыкамэнтамі.

Усе раённыя мэдычныя ўстановы (больніцы і амбуляторыі) наладжваюць дажурствы мэдычнага пэрсаналу для аказаньня дапамогі калгаснікам і іншаму працоўнаму сялянству. На час сяўбы будуць арганізаваны лекавыя перасоўныя пункты.

Усе акруговыя інспэктарыяты аховы здароўя вылучаюць брыгады з дактароў-спэцыялістых, якія разьедуцца па раёнах для азнаямленьня мясцовых мэдработнікаў з арганізацыяй практычнай мэддапамогі.

Прапанавана ўсім акркалгассаюзам забясьпечыць калгасы аптэчкамі.

Чырвоны сьцяг і трактар лепшаму калгасу

Сакратарыят ЦВК БССР устанавіў для лепшага калгасу БССР сталую прэмію — пераходзячы чырвоны сьцяг і трактар.

Выдача прэміі дапасоўваецца да сьвята дня ўраджаю і калектывізацыі.

Муніцыпалізаваныя дамы перадаюцца жактам

Спэцыяльная тэхнічная камісія камгасу праводзіць абсьледваньне ўсіх муніцыпалізаваных дамоў, якія ў бліжэйшы час перадаюцца жактам. Усяго будзе перададзена жактам каля 1.000 дамоў.

Выпуск лікпунктаў

Гэтымі днямі адбыўся пленум Менскага таварыства «Прэч Няпісьменнасьць», на якім была падагулена праца па ліквідацыі няпісьменнасьці ў зімовы час і вызначаны плян работы на летні парыяд.

З 10-га красавіка па ўсіх лікпунктах і школах малапісьменных будзе праводзіцца праверка таго, наколькі нашы грамадзкія арганізацыі справіліся з задачамі, пастаўленымі партыяй і ўрадам па ліквідацыі няпісьменнасьці.

З 15 па 25 красавіка заканчваюць работу лікпункты і школы малапісьменных. З 25 красавіка па 1-га мая будуць праведзены масавыя вечары выпускнікоў лікпунктаў і школ малапісьменных.

Чужы элемэнт выключаны з БДУ

За ўтойваньне сацыяльнага становішча выключаны з ліку студэнтаў БДУ: **З. Дунько** (пэдфак), як варожы элемэнт; **Я. Бажок** (пэдфак)—трымаў цесную сувязь з кулакамі, вораг калектывізацыі; **Гусарэвіч** (праўгас)—меў сувязь з бацькам-попам; **Блюмін** (праўгас) — сын буйнога лесапрамысловцы і інш.

ЗА ДЗЕНЬ

— Саюз швэйнікаў пачаў пабудову **30-кватэрнага дому для рабочых фабрыкі «Кастрычнік».** Пры доме будзе абсталявана сталоўка, клюб і ванная.

— З 22-га лютага па 20-га сакавіка паступіла на Меншчыне ў фонд індустрыялізацыі краю добраахвотных узносаў: золота звыш 2 кілё і серабра 52 кілё.

— НК РСІ пастанавіў **ліквідаваць усе акруговыя аптэкакіраўніцтвы** і перадаць іх функцыі Белмэдгандлю.

— 2-га красавіка пры сэкцыі вытворчасьці і зарплаты ЦСПСБ адбудзецца нарада прадстаўнікоў ФЗ, МК, НКП і ВСНГ па **пытаньні кантрольных лічбаў** на 1930--31 год і парадку прапрацоўкі іх на прадпрыемствах. На гэтай нарадзе будуць пастаўлены даклады ВСНГ і Дзяржпляну аб кантрольных лічбах.

— Менскі акрінспэктарыят аховы здароўя паслаў на час веснавой пасеўнай кампаніі ў раёны **70 дактароў** з Менску для мэдычнага абслугоўваньня калгаснікаў. Апрача таго, дактары будуць весьці грамадзкую работу ў калгасах.

— У хуткім часе ў Менску распачнецца **тыдзень па пажарнай ахове.**

30-га сакавіка адбыўся гарадзкі сход актыву фізкультурнікаў. За дакладам аб **выніках першай усебеларускай міжсаюзнай канфэрэнцыі фізкультурнікаў** выступіў старшыня бюро фізкультуры пры ЦСПСБ т. Клімковіч. На сход зьявілася больш за 200 актывістых.

— НКАЗ распрацаваў праект пастановы аб **пэрыядычных надбаўках да зарплаты** санітарным і школьна-санітарным дактаром і дактаром-пэдолёгам. Пэрыядычныя надбаўкі атрымаюць тыя дактары, якія маюць 3-хгадовы стаж у гэтай галіне.

— У Менск перавезены з Ленінграду экспанаты **яўрэйскага гістарычна-культурнага музэю,** які будзе разьмешчаны ў беларускім дзяржаўным музэі.

Водгукі на заметкі

ЗЬНЯТЫ З РАБОТЫ І ПЕРАВЕДЗЕНЫ НА НІЖЭЙШЫЯ ПАСАДЫ

Заметкі «Акцыпор Крукоўскі награжае ражэніцы» і «Блёк трох» рэдакцыяй пасыраліся на расьсьледваньне ў Менскую акр. інспэкцыю аховы здароўя. Нам паведамілі, што доктар **Крукоўскі,** лекпом **Цюрын з работы зьняты,** доктар **Разоўскі** з Зэмбінскага вучастку адкліканы, доктар **Бэрыштэйн** прызначан на ніжэйшую пасаду, **атрымаўшы вымову з папярэджаньнем.**

ІТКІН ЗЬНЯТ З РАБОТЫ

Рабкор паведамляў, што былы інспэктар Віцебскага акрэа па лесзагу Іткін, будучы ўпоўнаважаным ліквідкому Віцебскага лесзагу, самаўласна перайшоў на работу ў Лесбел. У выніку чаго выйшла, што сам перадаваў і сам прымаў справы. Заметка пацьвердзілася. Раней **Іткін атрымаў вымову** за недобрасумленныя адносіны да сваіх абавязкаў.

Пры чыстцы партыі Іткін атрымаў партспагнаньне, а зараз **зьнят з работы.**

ГАНДЛЯР І ЯГО ПАМОЧНІК — ВЫКЛЮЧАНЫ З САВЕЦКАЙ УСТАНОВЫ

Старшыня Нараўлянскага спажывецкага таварыства **Казлоў,** як паведамляў нам селькор, прыняў на работу вычышчанага на 1-й катэгорыі Майзьліна ў якасьці загатоўшчыка.

Мазырская АКК паведаміла, што Майзьлін зьнят з работы па 1-й катэгорыі з забаронай працаваць ва ўсіх савецкіх, грамадзкіх і каапэрацыйных установах і прадпрыемствах СССР, як былы гандляр, за ашуканства сялян і за парушэньне лімітных цэн.

Старшыня спаж. т-ва Казлоў зьнят з работы з забаронай працаваць у каапэрацыі наогул, а на адказных пасадах у савецкіх і грамадзкіх установах на працягу 2-х год за рад момантаў няўменьня працаваць.

СОКАЛ АТРЫМАЎ ПА ЗАСЛУГАХ

У заметцы «Крытыка пад падэшвай» рабкор **З—кі** пісаў, што старшыня Дараганаўскага спажывецкага т-ва Сокал, ён-жа сакратар парт'ячэйкі, груба адносіцца да насельніцтва, скрыўляе клясавую лінію, прымаў на работу пазбаўленых выбарчых правоў. У якасьці вучнёўкі Сокал прыняў на работу 35-ці гадовую жанчыну, член сям'і якое высланы за контр - рэвалюцыйную дзейнасьць. Самакрытыка была заціснута.

Расьсьледваньнем факты пацьвердзіліся. Камісіяй па чыстцы савецкага апарату Сокал з работы зьняты па 3-й катэгорыі. Акруговая камісія, дзе разглядалася яго справа, пастанавіла зьняць Сокала на другой катэгорыі і паведаміла РК КП(б)Б аб разглядзе яго справы ў партпарадку.

АНТАНІШЫН І ЮДОВІЧ ВЫКЛЮЧАНЫ З ПАРТЫІ

Загадчык Мазырскага акруговага агентства дзяржстрахаваньня Антанішын звольніў прыбіральніцу, а на яе месца залічыў сваю жонку. Раней ён зрабіў растрату.

Загадчык сакрэтнай часьці Мазырскага АВК Юдовіч захаваў сацыяльнае паходжэньне, меў сувязь з чужым элемэнтам, скарыстоўваў у асабістых мэтах службовае становішча.

Мазырская АКК паведаміла, што факты, паказаныя ў заметцы, расьсьледваньнем пацьвердзіліся. Антанішын і Юдовіч у часе праверкі з партыі выключаны.

Мопраўскія арганізацыі рыхтуюцца да 1-га мая

Уся работа мопраўскіх арганізацый за апошні год была накіравана на ўсямернае разгортваньне інтэрнацыянальна-выхаваўчай работы сярод членаў МОПР'у.

Праведзеныя ў Менску, Гомелі і Віцебску акруговыя політпрапагандысцкія канфэрэнцыі, масавыя інтэрнацыянальныя вечары, арганізаваныя нізавымі ячэйкамі МОПР'у сходы членаў МОПР'у, канфэрэнцыі піянэраў, камсамольцаў з удзелам выдатных рэвалюцыянэраў **тав. Ланцуцкага і Макса Гэльца** ў Менску і Віцебску, масавыя мерапрыемствы, праведзеныя ў гэтым годзе ў дзень 18-га сакавіка ўсімі нізавымі ячэйкамі Савецкай Беларусі,—сьведчаць аб дасягнутым пераломе ў адносінах пераходу ячэек на штодзённую агітацыйна-выхаваўчую работу.

З мэтаю яшчэ большага разгортваньня інтэрнацыянальнага выхаваньня членаў МОПР'у, акругкомы МОПР'у ўжо прыступілі да падрыхтоўкі да сьвяткаваньня міжнароднага дня пралетарскай салідарнасьці—1-га мая.

На працягу красавіка месяца акругкомамі МОПР'у БССР будуць праведзены куставыя сходы - канфэрэнцыі мопраўцаў асобных груп (вытворчых, савецкіх, чырвоناармейскіх, вучнёўскіх, саматужнікаў і жакцкіх ячэек МОПР'у), а таксама дэлегацкіх сходаў пад знакам разгортваньня інтэрнацыянальнай работы і падрыхтоўкі да 1-га мая.

1-га і 2-га мая на ўсіх акругах БССР будзе праведзен мопраўскімі арганізацыямі **скарбоначны збор з «чырвонай кветкай»** на карысьць ахвяр фашызму (палітзьняволеных і іх сем'яў).

Менскі акругком МОПР'у рыхтуе першамайскі **мастацкі карнавал,** які будзе характарызаваць пралетарскую салідарнасьць мопраўцаў з рэвалюцыйным рухам міжнароднага пралетарыяту, удзел МОПР'у ў сацыялістычным будаўніцтве (распаўсюджваньне пазыкі індустрыялізацыі, удзел у збожжа і бульбазагатоўках, збор лому і каштоўнасьцяй, удзел у засеўнай кампаніі і калектывізацыі і г. д.). (Менакругком МОПР'у склікаў на 4-га красавіка агульны сход саматужнікаў г. Менску, на 6 красавіка—пашыраную чырвонаармейскую канфэрэнцыю па пытаньнях інтэрнацыянальнай работы. У бліжэйшыя дні Фрунзаўскі і Кастрычніцкі райкомы МОПР'у праводзяць канфэрэнцыі вытворчых ячэек МОПР'у па пытаньні аб новых формах і мэтадах работы ў сувязі з рэканструкцыйным перыядам і аб інтэрнацыянальнай выхаваўчай рабоце.

Сваячасовае разгортваньне падрыхтоўкі мопраўскіх арганізацый да 1-га мая дасьць жаданыя вынікі ў галіне пераходу ад кампанейшчыны да сыстэматычнай агітвыхаваўчай работы.

ЦУДЗІН.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Камісіяй ЦКК-РСІ па чыстцы апарату ВСНГБ і МК ВСНГ сёньня, 5/IV, у 19 гадз. у ВСНГ склікаецца нарада МК, ЭК, рэдкалегій насьценгазэт усіх надпарадкаваных ВСНГБ трэстаў і гаспадарчых аддзілак г. Менску сумесна з адміністрацыяй апошніх па пытаньні аб удзеле ў праверцы працы ВСНГБ і чыстцы апарату апошняга.

У сувязі з важнасьцю пытаньня прысутнасьць грамадзкіх арганізацый і адміністрацыі трэстаў і гасп. аддзілак—абавязкова.

СЁНЬНЯ

— **Дом Камасьветы.** А 7-й гадз. веч. (пакой 21) — індывідуальная кансультацыя т. **Доўгаполава** па антырэлігійнай прапагандзе. Ад 7-й да 9 гадз. (пакой № 3) — **заняткі гуртка нямецкай мовы.**

— **Клюб «Чырвоны Будаўнік»** (Вул. Энгельса). Сёньня, а 7-й гадз., **сход работніц і жонак рабочых саюзу будаўнікоў.** Пасьля сходу кіно.

— **БДУ.** А 18-й гадз. паўторныя **перавыбарчыя сходы** парт'ячэек факультэтаў народнае гаспадаркі і савецкага будаўніцтва. Сход яч. факультэту Нарпас — у актавай залі БДУ. Сход яч. факультэту сав. будаўніцтва — у 41 аўдыторыі.

ЗАЎТРА

— **Клюб друкароў.** А 7-й гадз. веч. **пасяджэньне Белбюро сэкцыі працаўнікоў друку.** Парадак дня: аб сродках на падрыхтоўку і перападрыхтоўку кадраў (т. Шастакоў); аб пасылцы на курорт (т. Дайн); даклад мясцкому газэты «Бел. Вёска».

— **Клюб мэталістых.** А 7-й гадз. веч. у памяшк. клюбу (Унівэрсытэцкая вул.) —**раённы вечар дэлегатак Кастрычніцкага раёну.**

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

7-га красавіка г. г. у ЦК КП(б)Б адкрываецца

партыйная транспартная нарада.

У парадку дня:

1. Чарговыя задачы партыйнай арганізацыі на транспарце.
2. Становішча і задачы гаспадарчай работы на транспарце і падрыхтоўка кадраў.
3. Аб масавай рабоце і абслугоўваньні культурна-бытавых патрэб рабочых на транспарце.

5-га красавіка г.г. Фрунзаўскі РК КП(б)Б і ЦСПСБ

СКЛІКАЮЦЬ

РАЕННУЮ БЕСПАРТЫЙНУЮ РАБОЧУЮ КАНФЭРЭНЦЫЮ

з наступным парадкам дня:

1. Міжнароднае і ўнутранае становішча СССР і задачы рабочае клясы (дакл. тав. **ГЕЙ**).
2. Становішча і задачы рабочага забесьпячэньня (дакл. т. **СЛАВІНСКІ**)
3. Задачы рабочага шэфства над дзяржапаратам (дакл. т. **КАЛІНІН**).

Канфэрэнцыя пачнецца а 6-й гадз. увечары ў памяшканьні клюбу **саўгандальслужачых.**

Мандаты дэлегатаў будуць расасланы па фабзаўмясцкомах.

У нядзелю, 6-га красавіка, а 6½ гадз. веч. у памяшканьні **Дому Камасьветы**

АДБУДЗЕЦЦА

сход камсамольскага актыву.

У парадку дня:

даклад тав. СЛАВІНСКАГА АБ ВЫНІКАХ ПЛЕНУМУ ЦК КП(б)Б.

Камсамольцы-партыйцы ад партсходаў вызваляюцца. Уваход на білетах.

7-га красавіка, а 10-й гадз. раніцы, у **памяшканьні клюбу друкароў**

скліканецца

нарада калгасьніц і саўгасьніц прыгараднага сельсавету

з наступным парадкам дня:

1) Аб веснавой пасеўнай кампаніі; 2) Удзел калгасьніц і саўгасьніц у грамадзкай рабоце.

Канфэрэнцыя вайсковых ячэек МОПР'у Менскага гарнізону

КЛЮБ АКРВЫКАНКОМУ (пляц Волі)

Нядзеля, 6 красавіка | **Менскі Акруговы Комітэт МОПР'у** СКЛІКАЕ **ПАШЫРАНУЮ КАНФЭРЭНЦЫЮ** | Нядзеля, 6 красавіка

ВАЙСКОВЫХ ЯЧЭЕК МОПР'у Менск. гарнізону.

ПАРАДАК ДНЯ: Даклад аб новых формах і мэтадах работы МОПР'у і аб інтэрнацыянальным выхаваньні членаў МОПР'у.

ПАСЬЛЯ СХОДУ—НОВЫ МОПРАЎСКІ КІНО-ФІЛЬМ.

Модуо прадстаўніцтва--1 дэлегат на 15 членаў МОПР'у.

Дэлегаты з раёнаў павінны зьявіцца раніцою 6-га красавіка ў АК МОПР.

Пачатак роўна а 7 гадз. увечары.

Мен. АК МОПР'у.

Праўленьне клюбу гарбароў сумесна з менскім аддзяленьнем Дзяржгандбелу

5-га красавіка наладжвае для членаў саюзу гарбароў

ВЕЧАР, ПРЫСЬВЕЧАНЫ ЗБОРУ УТЫЛЬСЫРЦУ.

Жадаючыя прысутнічаць на вечары павінны прынесьці утыль. Т.т., якія прынясуць 3 кгр. утыля будуць удзельнічаць у дармовай лётарэі.

Пачатак а 8 гадз. увечары.

Праўленьне клюбу друкароў сумесна з юнсакцыяй наладжвае **ВЯЛІКІ ВЕЧАР**

„РВАНАЙ ГАЛЁШЫ"

ВЕЧАР АДБУДЗЕЦЦА 8-га КРАСАВІКА

Праграма вечару:

1. Канцэрт з удзелам артыстаў Ленінградзкіх і Маскоўскіх тэатраў.
2. Балетнае адзяленьне.
3. Сымфанічны аркестр.
4. Утыль віктарына.

ЗА ЛЕПШЫЯ АДКАЗЫ АТРЫМОЎВАЮЦЬ ПРЫЗЫ.

Грае духавы аркестр музыкі.

На вечар пападуць тыя, хто прынясе ня менш 2-х кілеграм рознага утылю.

Утыль адменьваецца на білет штодзённа ў клюбе ад 6-й да 9-ай гадзіны.

КІНО-ТЭАТР **КУЛЬТУРА**

ЮДА

Пачатак сэансаў:
ДЗЕННЫЯ а 1 гадз. і 3 г. 15 м.
ВЯЧЭРНІЯ а 7 г., 8 г. 30 м. і 10 г. 30 м.
Каса—ад 12 г. дня.

КІНО **Інтэрнацыянал**

ДУГЛАС МАК-ЛІН у амэрыканскай карціне
ЛЕЙТЭНАНТ РЫЛЕЙ
(Прыгоды ў Сан-Францыскова).
Звыш праграмы кіно хроніка «Совкино» № 14.
ДЗЕННЫЯ а 1 г. 30 м. і 3 г.
ВЯЧЭРНІЯ а 6 г., 7 г. 30 м., 9 г. і 10 г. 30 м.
Каса адчынена ад 12 г. дня.

КІНО **Пралетары**

2-гі тыдзень 2-гі
БЭЦЬЦІ КАМПСОН у амэрыканскім фільме
У ДОКАХ НЬЮ-ЁРКА
у 8 част.
Штодзённа 4 сэансы:
6 гадз., 7 гадз. 30 м., 9 гадз. і 10 г. 50 м.
КАСА адкрыта ад 5 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр **Юны Піянэр**

Мастацкі фільм
АБЛОМАК ІМПЭРЫІ
драма у 6 част.
Штодзённа 2 сэансы.
Пачатак 1-га сэансу а 1 гадз., 2-га—2 г. 30 м.
Каса адкрыта ад 12 гадз.

КІНО **Спартак**

Мастацкі баявік
ЧАЛАВЕК З ЛЕСУ
драма ў 7 частках
Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз.
КАСА—ад 5 г. 30 м.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР
Сезон 1929-1930 году (чацьверты) у Менску

Субота, 5 красавіка для саюзу швэйнікаў.

Б. Лаўрэнеў.
РАЗЛОМ
п'еса ў 4-х дзеях.

Рэшта білетаў у касе тэатру і ў рабочай касе. **Пачатак а 9 гадз.**

ГАТЭЛЬ
„САВОЙ"

Павялічым засеўную плошчу на 277 тысяч гэктараў

Павялічэньне засеўнай плошчы ў сёлетнюю вясну— баявая задача ўсіх калгасаў, саўгасаў і індывідуальных бядняцка-сераднацкіх гаспадарак.

Дырэктывы ЦК КП(б)Б і СНК БССР ставяць задачу пашырэньня пасеўнай плошчы як адказьнейшую працу ўсіх партыйных, савецкіх, каапэрацыйных і грамадзкіх арганізацый і ўстаноў, як на вёсцы, так і ў горадзе. Канкрэтныя спосабы выкананьня гэтай падачы высьвятляюцца ў кніжцы **К. Кіпрыяна «За павялічаньне засеўнай плошчы ў вясну 1930 г.»,** выданьня Белдзяржвыдавецтва.

Кніжка вышла з друку тыражом у 25 тыс. экз.

КОШТ АДНАГО ЭКЗЭМПЛЯРУ 10 КАП.

Белдзяржвыдавецтва.

ЗЬБІРАЙЦЕ ЛЕКАВЫЯ ТРАВЫ!

Вучні школ і піянэр-атрады! Арганізуйце брыгады па зборы лекавых траў. Не давайце гінуць у палёх сотням тысяч рублёў!

Збор лекавых траў—

ДОБРЫ ЗАРАБОТАК

для дзяцей беднаты.

Белмэдгандаль у бягучым годзе, як і ў мінулыя гады, ПРАЗ УСЕ АПТЭКІ ў раёнах і ў гарадох Беларусі купляе высушаныя лекавыя расьліны: валер'ян, беляну, талакнянку, палынь (ліст), ліпавы цвет, чарніцы, ліпаподзі (дзерава), маліну сушаную, яхлавец (ягады), спарыньню (чорныя ражкі жыта), дуброўку—корань, крапіўны ліст, кару крушыны, кмен, смарчкі, хваёвыя пупышкі, рабіны (ягады), адуванчык (корань), мурашкавыя яйкі, канюшыну чырвоную, аерны корань

АЧЫШЧАНЫ.

Па ўсіх пытаньнях зварачацца ў бліжэйшую аптэку.

Белмэдгандаль, Менск, Пляц Волі, 29.

---

50 К. кошт публікацыі аб згубе дакумента

Усім калгасам, саўгасам, аграпунктам, школам сялянскай моладзі, хатам-чытальням трэба набыць

„БІБЛІЯТЭКУ ПА ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ",

якая складаецца з наступных кніжак:

ВЫДАНЬНЯ Б. Д. В.

1. **За буйную сацыялістычную жывёлагадоўлю.** (Зборнік пастаноў і дырэктыў партыйных і ўрадавых органаў па пытаньнях жывёлагадоўлі). Стар. 86. Цана 25 кап.
2. С. П. ТАКМАЧОЎ.—Увага жывёлагадоўлі. Стар. 40. Цана 8 кап.
3. Е. ЛІСКУН.—Карысьць ад правільнага кармленьня і догляду малочнай скаціны. Стар. 46. Цана 10 кап.
4. КУЛІКОЎ і УХІН.—Колькі трэба корму карове на год. Стар. 112. Цана 20 кап.
5. І. М. СЕРАДА.—Пабудова сілосаў у калгасах і саўгасах. Стар. 52. Цана 20 кап.
6. Г. А. МАЛЬКОВІЧ.—Пабудова аборы для аграмаджаных гаспадарак. Стар. 40. Цана 18 кап.
7. М. В. МАСЬЛЕНЬНІКАЎ.—Што трэба ведаць аб даеньні кароў. Стар. 46. Цана 12 кап.
8. КАЗАНЦАЎ.—Утрыманьне племяннога бугая. Стар. 48. Цана 15 кап.
9. В. А. ОЗЕРАЎ.—Цельнасьць і цяленьне. Стар. 102. Цана 25 кап.
10. В. БОЙКА.—Як гадаваць цялё. Стар. 40. Цана 10 кап.
11. В. АВЗРБУРГ.—Хваробы рагатае скаціны. Стар. 56. Цана 20 кап.
12. А. МАКАРЭЎСКІ.—Сухоты жывёлы. Стар. 24. Цана 10 кап.
13. Л. МАКАРЭЎСКІ.—Запаленьне лёгкіх у рагатай жывёлы. Стар. 20. Цана 8 кап.
14. М. ЖАРЫН.—Сібірка. Стар. 36. Цана 10 кап.
15. МАКАРЭЎСКІ.—Кароста ў жывёлы і птушак. Стар. 42. Цана 20 кап.
16. А. БЭЛІЦЭР.—Як папераджаць і лячыць кароту ў коняй. Стар. 23. Цана 10 кап.
17. І. АЎЧЫНЬНІКАЎ.—Галоўныя паразіты свойскае жывёлы. Стар. 66. Цана 15 кап.
18. С. ЖУРЫК.—Як выгадаваць добрых парасят. Стар. 40. Цана 10 кап.
19. Г. ПАЎЛАЎ.—Як выгадна гадаваць сьвіней. Стар. 62. Цана 20 кап.
20. С. І. ЖУРЫК.—Пытаньні бэканізацыі ў БССР. Стар. 40. Цана 30 кап.
21. І. М. СЕРАДА.—Заразьлівыя хваробы сьвіней і як з імі змагацца. Стар. 56. Цана 20 кап.
22. І. М. СЕРАДА.—Курыныя хваробы. Стар. 70. Цана 20 кап.

ВЫДАНЬНЯ Н. К. З. БССР

23. ЛЯХОВІЧ.—Уцяпленьне і абсталяваньне хлявоў. Стар. 22. Цана 5 кап.
24. СЕРАДА.—Вадапой жывёлы ў хляве і на пашы. Стар. 26. Цана 10 кап.
25. А. Х. ГАЛУБЧЫК.—Прыбытковае трусаводзтва. Стар. 72. Цана 50 кап.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

ПАСТАНОВА

Народных Камісарыятаў Працы і Асьветы БССР

„Пра аспабаненьне ад працы тых пэдагогаў, якія працуюць не па сваёй спэцыяльнасьці"

Прымаючы пад увагу неабходнасьць поўнага забесьпячэньня выкананьня пляну ўсеагульнага абавязковага навучаньня і існуючы недахват значнай колькасьці пэдагогаў у першым і другім канцэнтрах сямігодак, Народныя Камісарыяты Працы і Асьветы на падставе пастановы СНК БССР за 14 сакавіка 1930 г. (пр. № 41) пастанавялюць:

I. Усе асобы, якія маюць сярэднюю або вышэйшую пэдагагічную асьвету і працуюць у сучасны момант у дзяржаўных, каапэрацыйных, грамадзкіх установах не на сваёй спэцыяльнасьці, павінны ў месячны тэрмін зарэгістравацца ў адпаведным акруговым інспэктарыяце народнае асьветы.

Ад рэгістрацыі вызваляюцца члены ЦВК БССР, асобы, страціўшыя звыш 50 проц. працаздольнасьці, па адпаведных даведках лекава-кантрольных камісій і усе асобы, якія займаюць выбарныя пасады.

II. Арганізаваць пры акруговых інспэктарыятах народнае асьветы камісіі ў складзе прадстаўнікоў акр. інспэктарыяту народнае асьветы (старшыня), акрінспэкцыі працы і прафсаюзу працаўнікоў асьветы для перасоўкі паказаных у арт. I работнікаў для непасрэднай працы ў навучальных установах.

Камісіі скончыць работу не позьней за I-VI 1930 г.

III. Не падлягаюць пераводу на пасаду настаўніка тыя асобы, якія раней былі звольнены з пасады настаўнікаў па сваёй недпаведнасьці ці не адпавядаюць згодна заключэньню камісіі.

IV. З ліку асоб, зарэгістраваных і прызнаных камісіяй годнымі ў якасьці настаўнікаў, 50 проц. скарыстоўваюцца непасрэдна акруговым інспэктарыятам пар. асьветы, а рэшта бранруецца за НКА і разьмяркоўваюцца апошнім па заяўках акруг не позьней 1 жніўня г. г.

V. У тых выпадках, калі перасоўка работніка зьвязана з пераменай месца пражываньня—яму выплачваюцца падёмныя і іншыя кампэнсацыі паводле пастановы ЦВК і СНК СССР за 9-IX-1927 г. (Изв. НКТ 1927 г. № 52).

VI. Асобы, якія ўхіляюцца ад рэгістрацыі па арт. I гэтай пастановы, прыцягваюцца да адказнасьці па арт. 102 крымінальнага кодэксу БССР, тыя-ж асобы, якія адмаўляюцца ад працы па спэцыяльнасьці, звынімаюцца з работы, на працягу 3-х месяцаў не рэгіструюцца на біржах працы і на гэты-ж тэрмін пазбаўляюцца права на атрыманьне дапамогі па беспрацоўі і ў парадку сацыяльнага страхаваньня.

23-III 1930 году.

Народны Камісар Працы БССР **ГНІЛЯКЕВІЧ.**
Народны Камісар Асьветы БССР **ПЛАТУН.**

Згубленыя і ўкрадзеныя

наступныя дакументы лічыць несапраўднымі:

Чл. паявая кн. № 1085 Масальскага А. Я., выд. Клясьціц. спаж. т-вам. 103
Паявая кн. Коршуна Д., выд. Клясьціц. спаж. т-вам. 104
Паявая кн. № 2132 Ганеева А. П., выд. Сіроцінск. спаж. т-вам. 105
Пашпарт № 118 Дорфмана М., выд. Альбрэхтаўск. с.-с. 106
Асабов. кн. № 558 Ярмоліча Ф. Г., выд. Тураўск. РВК. 107
Паявая кн. Кураша Ф. Я., выд. Клясьціц. спаж. т-вам. 108
Біржк. карт. Шкляр Г., выд. Мен. біржай працы. 109
Чл. біл. саюзу друкароў, в